

РАДАСЦІ, ЯКІХ МАГЛО І НЕ БЫЦЬ

Сямейная газета

ПРА ТРАДЫЦЫІ Ў СЯМ'І «ПЕСНЯРА»

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ВЕРАСНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 186 (29300)


## ЛІЧБА ДНЯ

**Больш за 2 тысячы**

*навінак, у тым ліку больш за 140 найменняў машын і абсталявання, 150 тэхналагічных працэсаў і каля 50 новых матэрыялаў і рэчываў плануецца стварыць па дзяржаўных навукова-тэхнічных праграмах на 2021—2025 гады. Запланаваны аб'ём фінансавання гэтых праграм перавысіць Br500 млн. Па заданнях праграм мяркуецца выпусціць прадукцыі не менш як на Br3,5 млрд і прыкладна 20 % ад усяго аб'ёму паставіць на экспарт.*

З першых вуснаў

# «У аснове дзяржаўнай палітыкі — чалавек і наша гатоўнасць на новым, якасным узроўні адпавядаць яго чаканням»

## Аб чым гаварыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі інаўгурацыі

**На цырымоніі ўступлення Прэзідэнта краіны на пасаду ў Палацы Незалежнасці прысутнічалі 700 чалавек — вышэйшыя службовыя асобы, парламентарыі, кіраўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, рэспубліканскіх СМІ, дзеячы навукі, культуры і спорту. Наш карэспандэнт таксама была сярод журналістаў прэзідэнцкага пула і мела магчымасць назіраць за падзеяй непасрэдна на месцы дзеяння. Саму ўрачыстасць усе ахвотныя мелі магчымасць бачыць у трансляцыі, мы ж рашылі зрабіць акцэнт на словах кіраўніка дзяржавы, якія гучалі падчас яго выступлення пасля прынесенай прысягі.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **У Пінску ў рацэ Піне зафіксаваны мор рыбы. Бачных забруджванняў на паверхні вады спецыялісты не выявілі.**
- Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху пройдзе ў Беларусі 25 верасня пад дэвізам «Час стаць прыкметным!»
- **Мінчанам прапануюць пасадзіць дрэвы ў сваіх дварах у межах акцыі «Зялёны двор разам».**
- Беларуская чыгунка з 27 верасня да 26 кастрычніка прызначыла новы цягнік Гомель — Віцебск. Новы маршрут звяжа тры абласныя цэнтры: Гомель, Віцебск і Магілёў.
- **Зімовы Еўрапейскі юнацкі алімпійскі фестываль, які прыме Вуакаці (Фінляндыя), перанесены з лютага на снежань 2021 года. Такое рашэнне прынята з-за пагрозы распаўсюджвання COVID-19 у свеце.**



Камунальныя стасункі

# АЗЕЛЯНЕННЕ, ЭКАСЦЕЖКІ, ВЕЛАПАРКОЎКІ

## Як наводзіцца парадак на зямлі ў Мінску

**Сёлета ў сталіцы высаджана ўжо больш за 30 тысяч дрэў і 105 тысяч кустоў, створана звыш 700 кампазіцый, добраўпарадкавана 500 тэрыторый на прадпрыемствах. А неўзабаве ўсе гарады, пасёлкі і іншыя населеныя пункты Беларусі будуць мець пацверджаныя схемы азяленених тэрыторый агульнага карыстання, дзе будуць вызначаны межы зямель, каб абмежаваць забудоўлю гэтых месцаў. У цэлым жа краіна пераходзіць ад маштабных забудоў да кропкавага планавання. Пра гэтыя і іншыя моманты, звязаныя з добраўпарадкаваннем, расказалі спецыялісты на прэс-канферэнцыі ў БелТА.**

СТАР. 2



Рыштаванні Бацькаўшчыны

# ПРАДАЕЦЦА... СПАДЧЫНА РАДЗІВІЛАЎ

## Княжацкі палац у вёсцы Паланечка можна купіць па цане іншамаркі

**Стаць уладальнікам старадаўняга палаца — мара, якую ў нашы дні не так складана ажыццявіць, як здаецца на першы погляд. Іншая справа, што рэстаўрацыя і ўтрыманне помніка архітэктуры патрабуюць вельмі сур'ёзных матэрыяльных укладанняў, таму выстаўленыя на аўкцыён (часам за сімвалічныя для такога «набытку» грошы), старадаўнія сядзібы з цяжкасцю і досыць рэдка знаходзяць гаспадароў. Напрыклад, палац Радзівілаў у ціхай вёсцы Паланечка выстаўляўся на аўкцыён больш за чатырнаццаць разоў.**

Паланечка — ціхая, чысценькая і ўтульная вёсачка ў Баранавіцкім раёне. У цэнтры населенага пункта, на яго галоўнай вуліцы размешчаны палац Радзівілаў.

— Будынак цяпер закансерваваны, — расказвае **старшыня Вольнаўскага сельвыканкама**, да якога належыць і Паланечка, **Наталля ІБРАГІМАВА**. — Ён досыць нядрэнна захаваўся — практычна цалкам, нават дах не праваліўся. Праўда, два гады таму ўмовы надвор'я пашкодзілі будынак: лівень падмыў падмурак і абрынулася частка сцяны — зараз гэты праём закрыты металапрофілем.

СТАР. 3



Княжацкая спадчына ўжо чатырнаццаць разоў выстаўлялася на аўкцыён.

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# «У аснове дзяржаўнай палітыкі — чалавек і наша гатоўнасць на новым, якасным узроўні адпавядаць яго чаканням»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка пачаў сваю прамову словамі, што дае клятву на вернасць Айчыне і народу з асаблівым пачуццём — «гордасці за беларусаў, якія прайшлі выпрабаванне на трываласць сваіх перакананняў».

«Дзень уступлення на пасаду Прэзідэнта, дзень інаўгурацыі — гэта дзень нашай з вамі перамогі, пераканаўчай і лёсавызначальнай. Мы не проста выбіралі Прэзідэнта краіны, мы абаранялі свае каштоўнасці, наша мірнае жыццё, наш суверэнітэт і нашу незалежнасць. І ў гэтым плане нам належыць яшчэ нямала зрабіць», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, бягучы год увойдзе ў гісторыю Беларусі як крайне эмацыянальны перыяд, калі нашай дзяржаўнасці быў кінуты выклік неаднаразова адпрацаваных тэхналогій знішчэння незалежных дзяржаў. «Але мы апынуліся ў ліку нямногіх краін (магчыма, адзіныя), дзе «каляровая рэвалюцыя» не адбылася. І гэта выбар беларусаў, якія ні ў якім разе не жадаюць страціць краіну, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы ўпэўніліся, што ***нашы грамадзяне ў абсалютнай большасці любяць сваю зямлю, жадаюць ёй міру, спакою і росквіту.*** *Нягледзячы на па-д'ябальску ўдасканаленыя падштурхоўванні звонку, захавалі павагу адзін да аднаго».*

Як адзначыў Прэзідэнт, калісьці народ Беларусі лёгка і нечакана займеў сваю незалежнасць і доўга ўспрымаў яе як данасць. «Сёння, выпакутаваўшы гэту перамогу, мы падняліся на новую прыступку самаўсведамлення, астыўшы ад гарачкі электаральных баталій, убачылі, як узрастае ўся наша нацыя. І хай Беларусь па сусветных мерках зусім маладая і незалежная дзяржава. Але ***беларусы як нацыя ўжо не дзеці — мы народ»,*** — працягнуў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначыў, што, знаходзячыся ў сусветным крызісе, мы павінны вярнуць краіну да бяспечнага жыцця, якое было ў нас заўсёды, прыйсці да згоды дзеля будучыні. «І мы гэта зробім. Я не магу, не маю права кінуць беларусаў, якія звязалі з дзяржаўным курсам не толькі палітычныя перавагі, але і свой лёс, будучыню сваіх дзяцей, усіх, хто ў такі складаны для Беларусі перыяд, застаўся верны краіне і народу. Гэта тыя, хто геравічна супрацьстаяў пагрозе пандэміі, праяўляючы свае найлепшыя прафесійныя і чалавечыя якасці, хто захаваў здаровы сэнс ва ўмове дэзарыентацыі грамадства», — сказаў Прэзідэнт.

«Я ўбачыў людзей у справе, зразумеў, што не толькі мяне, але і наш народ атачаюць патрыёты. Ва ўмовах паствыбарчых абставін калектывы прадпрыемстваў паказалі ўсю сваю мудрасць, выбраўшы цэх, а не плошчу. Не падвялі працаўнікі сяла, дзякуючы ім усе гэтыя месяцы рэгіёны жылі звычайным жыццём — людзі апрацоўвалі і ўбіралі ўраджай з палёў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў, што сіла беларускай улады, залог даверу да яе — у тым, што нават у самыя складаныя часы мы не адмаўляліся ад сваёй сацыяльнай палітыкі, сацыяльна арыентаванай дзяржавы. Падтрымка пенсіянераў, шматдзетных і іншых уразлівых слаёў насельніцтва застанецца шляхам краіны пры любых абставінах.

«Важна, каб і моладзь захавала павагу да сваіх бацькоў. У нашых дзяцей перад вачыма ёсць годны прыклад рацыянальнай мудрасці. Мы паказалі, што ***стварэнне новага магчыма толькі на базе таго, што дасягнулі»,*** — звярнуў увагу кіраўнік краіны.

Ён заявіў, што дзяржава не адступіць ад сістэмнага руху наперад і не адмовіцца ад стаўкі на навацыі. Прэзідэнт мяркуе, што мудрыя інвестары, якія мысляць катэгорыямі трансдынамічнай камерцыі, ацэняць дзеянні па стварэнні прыцягальных умоў для бізнесу.

***«У аснове дзяржаўнай палітыкі — чалавек і наша гатоўнасць на новым, якасным узроўні адпавядаць яго чаканням. Таксама ў ліку прыярытэтаў — новае грамадства, яно накіравана на больш актыўнае прасоўванне грамадска-палітычных ініцыятыў»,*** — дадаў Прэзідэнт. Ён нагадаў пра работу над новай Канстытуцыяй, пра неабходнасць стварыць умовы для развіцця сапраўднай партыйнай сістэмы, удасканаліць выбарчае заканадаўства, адпрацаваць пытанні рэфармавання мясцовага самакіравання. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсё гэта ўжо робіцца і выказаў упэўненасць, што ***адзінай формулай выжывання Беларусі з'яўляецца моцная ўлада, правільнасць курсу і падтрымка людзей.***

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што аснова развіцця — воля народа ў сваёй краіне: ***«І мы самі без знешняга ўдзелу разбяромся ў нашых праблемах, прыйдзем да згоды, забяспечым супрацоўніцтва ўсіх слаёў грамадства, прытрымліваючыся законнасці і ўзаемапавагі. Як любая моцная дзяржава, мы застанёмся адкрытымі і дружалюбнымі. На скрыжаванні геапалітычных платформаў мы маем намер захаваць сваю міратворчую місію».***

Ён разлічвае, што сёння, устаяўшы перад масіраваным уплывам тэхналогій, Беларусь стане донарам стабільнасці. Аляксандр Лукашэнка пералічыў, што мы выходзім з выпрабаванняў цяжкога 2020 года з абноўленай медыцынай, сучаснымі формамі самаарганізацыі грамадства, праверыўшы на стрэсаўстойлівасць сельскую гаспадарку, узмацніўшы энергетычную бяспеку.

«Беспрэцэдэнтны знешні ціск толькі загартаваў нас, зрабіў больш рашучымі і бескампраміснымі ў барацьбе за сваё. Чужога нам не трэба. Калі нам і прадбачацца новыя экзамены, мы гатовыя да іх. ***Услед за сусветнымі крызісамі абавязкова прыходзіць развіццё.*** Мяркую, што аднаўленне сусветнага грамадскага жыцця будзе імклівае. Таму мы можам разлічваць на хуткі росквіт новых эканамічных, лагістычных, тэхналагічных і іншых рашэнняў», — канстатаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да беларусаў і сказаў, што ***«ва ўсіх выпрабаваннях мы не страцілі сябе, а значыць здольныя самі будаваць тую краіну, якую любім і пра якую марым».***

«Я зраблю ўсё, каб вы ніколі не пашкадавалі, што першым Прэзідэнтам нашай Беларусі быў я», — завяршыў прамову кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# АЗЕЛЯНЕННЕ, ЭКАСЦЕЖКІ, ВЕЛАПАРКОЎКІ

## ПАСАДЗІ СВАЁ ДРЭВА

Асаблівая ўвага падчас мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі ўдзяляецца дадатковаму азеляненню вуліц і двароў, адхонаў асноўных транспартных магістраляў. А падчас традыцыйнага месячніка па навядзенні парадку на зямлі, які пачаўся ў Мінску з 19 верасня, на кальцавой аўтадарозе з'явіцца 57 тысяч дэкаратыўных кустоў, якія складуцца ў прыгожыя кампазіцыі, расказаў **Уладзімір ЛЕБЕДЗЬ, начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама.**

Традыцыйна праходзіць у сталіцы і акцыя «Зялёны двор разам». Уладзімір Лебедзь запрасіў усіх жыхароў прыняць у ёй удзел і добраўпарадкаваць свае двары.

— Для гэтага неабходна зайсці на сайт, зарэгістравацца і выказаць нейкае сваё жаданне і бачанне, што і дзе ў двары мяркуецца пасадзіць, а таксама ўзгадніць месца з адпаведнымі службамі. З заяўнікам звяжуцца і нават прапануюць матэрыял для пасадкі. Сталіца заўжды славілася вялікімі аб'ёмамі работы, якія праводзіліся вясной і ўвосень, у тым ліку і з актыўным удзелам грамадзян, за што ім вялікі дзякуй.

Для ўдзелу ў акцыі, дарэчы, ужо запісалася больш як 700 чалавек, і лічба гэтая працягвае расці.

## КАМФОРТ ДЛЯ СПОРТУ, ГУЛЬНЯЎ І ВЫГУЛУ САБАК

Схемы азяленены тэрыторый агульнага карыстання, якія распрацоўваюцца ў краіне, закліканы не дапусціць вольнага абыходжання з зялёнымі насаджэннямі, а таксама спрыяць стварэнню камфортных умоў пражывання і ў цэлым фарміраванню асяроддзя гарадоў і вёсак, акрэсліла **Вольга ВЕРАМЕЙ, начальнік галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Мінбудархітэктуры:**

— Немалаважную ролю пры гэтым забяспечвае выкананне ўстаноўленых патрабаванняў па наяўнасці ў жыллёвай забудове пляцовак для заняткаў фізкультурай, гульняў дзяцей, адпачынку дарослых. Месцаў для гаспадарчых мэт і захоўвання транспарту, пляцовак для выгулу сабак, развіццё веладарожак.

Адпаведна са створанай нарматыўнай базай прадугледжваецца таксама апераджальнае развіццё інжынернай і транспартнай інфраструктуры. А каб палепшыць якасць выдзяляемых зямельных участкаў для масавага жыллёвага будаўніцтва, створаны прэферэнцыі для забеспячэння комплекснай забудовы новых жылых раёнаў з арганізацыяй камфортнага жылога асяроддзя і яго забеспячэнне аб'ектамі сацыяльнай інфраструктуры.

— Час маштабных забудоў, падчас якіх з'явіліся такія мікрараёны, як Каменная Горка ў Мінску ці Білева ў Віцебску, заканчваецца. Мы пераходзім да кропкавага планавання, дэталёвых планаў кварталаў. Цэнтры двароў вызваляюцца ад аўтамабіляў, прадугледжваюцца велапаркоўкі, месцы для адпачынку насельніцтва: дзіцячыя пляцоўкі і зоны для заняткаў спортам. Падчас асваення тэрыторый прадугледжана таксама правільнае будаўніцтва жылых дамоў, дзіцячых садкоў і школ.

## СМЕЦЦЕВЫЯ ПАРУШЭННІ

За навядзеннем парадку на зямлі сочыць камітэт прыродных рэсурсаў. За 2020 год ім праведзена 552 кантрольныя мерапрыемствы, у выніку якіх вызначана больш за 400 парушэнняў і складзена 174 пратаколы. У асноўным не вытрымліваюцца правілы абыходжання з адходамі: несанкцыянаваныя звалкі, нераздзельны збор смецця, паведаміў **Дзмітрый ШУНЬКІН, намеснік старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Камітэт таксама рэгулюе распаўсюджванне інвазіўных раслін: баршчэўніку Сасноўскага і сумніку канадскага. Летась баршчэўнік рос у сталіцы на 40 гектарах, а ўжо сёлета ён сустракаецца на 28 гектарах.

Па ініцыятыве Мінпрыроды праведзена глабальная экалагічная кампанія «Добраўпарадкуем малую радзіму», якая працягваецца і дагэтуль, заўважыў ён:

— Яе мэта — зрабіць так, каб кожны грамадзянін у сваім пасёлку, сваім двары зрабіў пасільны ўнёсак: пасадзіў дрэва ці ўладкаваў кантэйнерную пляцоўку. Кампанія стартавала з Парку камянёў вясной 2018 года сумесна з Першамайскім раёнам сталіцы. Летась яна працягнулася акцыямі па закладцы парку сямейных дрэў у розных раёнах сталіцы.

Ужо два гады як у Мінску абсталёўваюцца экалагічныя сцежкі. Сёлета самай значнай у гэтым плане сталася арганізацыя другой часткі экасцежкі ў Заводскім раёне (каля заапарка). У планах з часам зрабіць і трэцюю яе частку.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Харчаванне

# Прадуктовыя крамы ў плюсе. За кошт рэстаранаў?

**Нацыянальны статыстычны камітэт падрыхтаваў аналітычную запіску «Аб развіцці ўнутранага гандлю і грамадскага харчавання ў студзені—жніўні гэтага года».**

Як аказалася, рознічны тавараабарот у краіне за восем месяцаў бягучага года склаў 34,5 млрд рублёў, або 102,7 % у супастаўных цэнах да ўзроўню студзеня—жніўня 2019 года. Аднадзённы рознічны тавараабарот у разліку на душу насельніцтва з пачатку года склаў 15 рублёў супраць 14,1 рубля за аналагічны перыяд мінулага года.

Рознічны тавараабарот арганізацый гандлю, на які прыйшлося 91,7 % рознічнага тавараабароту краіны, за гэты час склаў 31,6 млрд рублёў, або 104,3 % у супастаўных цэнах да адпаведнага перыяду папярэдняга года.

Спецыялістамі Белстата было адзначана, што падчас пандэміі людзі сталі менш наведваць сталовыя, кавярні і асабліва рэстараны. Тавараабарот грамадскага харчавання ў студзені—жніўні склаў 1,6 млрд рублёў, або 79,7 % у супастаўных цэнах да ўзроўню васьмі месяцаў мінулага года.

А вось аптовы тавараабарот у нас у апошні час злёгку «асеў» — з пачатку года ён склаў 61,9 млрд рублёў, або ў супастаўных цэнах 92,2 % да ўзроўню мінулага года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПРАДАЕЦЦА... СПАДЧЫНА РАДЗІВІЛАЎ



Да 1990-х гадоў у палацы была школа,
куды хадзілі некалькі пакаленняў жыхароў навакольных вёсак.

А ў цэлым стан палаца адносна нядрэнны. Выдатна захавалася нават старадаўняя лепка на франтоне — скульптурныя галовы антычных філосафаў. Такога элемента афармлення няма больш ні ў адным палацы або сядзібе на тэрыторыі нашай краіны.

## ПАЛАЦ І ЯГО НАСЕЛЬНІКІ

Падымацца да цэнтральнага ўвахода ў будынак трэба па старадаўняй лесвіцы — яе таксама не разбурыў час. Радзівілы сталі ўладальнікамі гэтых зямель у XVII стагоддзі, а ўзвялі ў Паланечцы палац — у XVIII. Тут было «сямейнае гняздо» той галіны знакамітага магнацкага роду, да якой належаў вядомы дзяржаўны дзеяч, пісьменнік і кампазітар Мацей Радзівіл. У гасцях у князя ў тыя часы ў Паланечцы бывалі выдатныя дзеячы культуры і мастацтва — напрыклад, расійскі літаратар Дзяніс Фанвізін.

Палац быў адносна невялікі (зразумела, толькі ў параўнанні з іншымі палацамі, што належалі роду Радзівілаў) і пабудаваны ў стылі класіцызму. Пры яго праектаванні за ўзор ўзялі вытанчаную архітэктуру італьянскай вілы Трывулзіна. Паступова вакол княжацкай рэзідэнцыі з'явіліся парк, гаспадарчыя пабудовы, аранжарэя для экзатычных раслін і каталіцкая капліца. Да нашых дзён «дажыў» толькі палац. Зрэшты, яшчэ ў Паланечцы з «радзівілаўскіх часоў» застаўся драўляны касцёл Святога Юрыя ў неагатычным стылі. Унутры храма захаваліся іконы XVIII стагоддзя.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Мацей Радзівіл з'ехаў з Паланечкі, а палац перайшоў ва ўласнасць ягонага сына Канстанціна. Малады гаспадар перабудаваў будынак у стылі ампір, які быў у модзе ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя. У выніку палац прыняў тое аблічча, якое мы можам убачыць сёння: з'явіліся чатырохгранныя калоны, увянчаныя лепкай — галовамі антычных філосафаў.

Ад інтэр'ераў палаца сёння захавалася толькі плітка XVIII стагоддзя на першым паверсе — чорна-белая, польскага брэнда Opoczno, яна выкладзена ў выглядзе шахматнай дошкі. А калісьці інтэр'еры палаца ўражвалі пышнасцю. Тут захоўваліся некаторыя карціны радавой галерэі Радзівілаў, унікальная бібліятэка (больш за 4000 старадаўніх кніг), творы мастацтва. У 1869 годзе Канстанцін Радзівіл памёр, а яго сын, які атрымаў у спадчыну палац, жыць у Паланечцы не пажадаў. З'язджаючы, ён забраў з сабой значную частку «скарбаў».

Прайшлі гады, перш чым унук Канстанціна, Альберт Станіслаў, вярнуўся ў радавое гняздо — ужо ў канцы XIX стагоддзя. Тады да будынка была прыбудавана шырокая парадная лесвіца, з'явіся неагатычны зімовы сад. Апошнім уладальнікам палаца ў Паланечцы стаў пляменнік Альберта, Уладзіслаў Радзівіл, які жыў у ім да самага ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі і толькі ў канцы 1930-х з'ехаў у Еўропу.

Вялікая Айчынная вайна не пашкадавала палац — ён быў пашкоджаны пажарам у 1943 годзе. Пасля Перамогі «радавое гняздо» Радзівілаў аднавілі (зразумела, без усялякай аглядкі на «гістарычнасць») і размясцілі тут школу, куды хадзілі ўсе дзеці з навакольных вёсак. Будынак пазбавіўся герба князёў Радзівілаў над парадным уваходам, была разабрана аранжарэя, у галерэі заклалі цэглай вокны. Калі ў пачатку 90-х палац прыйшоў у аварыйны стан, школу «перасялілі» ў іншы будынак, а старажытная пабудова засталася на балансе аддзела па адукацыі Баранавіцкага райвыканкама.

## У ДОБРЫЯ РУКІ

Сёння гістарычны будынак шукае новых гаспадароў. Першапачатковы кошт лота — 25 тысяч беларускіх рублёў, крыху менш за 10 тысяч долараў у эквіваленце. Але набыць старадаўнюю сядзібу — гэта толькі пачатак «вялікага шляху».

— Спатрэбяцца сур'ёзныя грашовыя ўкладанні, каб будынак перастаў быць «аварыйным». Драўляныя бэлькі на стале прагнілі, неабходна ўмацаваць падмурак, — адзначае Наталля Ібрагімава. — Але ж гэта не руіны — ёсць і сцены, і нават дах.

Праблема ў тым, што кожны помнік архітэктуры мае патрэбу не проста ў рамонце — уласнік абавязаны будзе менавіта адрэстаўрыраваць яго. А рэстаўрацыя значна падымае кошт будаўнічых і апрацоўчых работ, паколькі патрабуе спецыяльных матэрыялаў і высакакласных спецыялістаў. Акрамя таго, пры правядзенні аднаўленчых работ у гістарычным будынку кожны крок неабходна ўзгадняць з Міністэрствам культуры, іншымі зацікаўленымі ў захаванні гістарычнай спадчыны дзяржаўнымі структурамі. На ўсе гэтыя выдаткі — і часовыя, і матэрыяльныя — гатовы пайсці далёка не кожны інвестар. Акрамя таго, бізнес ёсць бізнес: укладанні павінны акупіцца. Паланечка знаходзіцца ўдалечыні ад буйных гарадоў — офісы ў старадаўнім будынку размясціць не атрымаецца, рэстаран наўрад ці будзе прыносіць прыбытак. Якой бачаць будучыню палаца мясцовыя ўлады, калі ўсё ж яго ўдасца прадаць?

— У ідэале, вядома, хацелася б стварыць «турыстычнае Радзівілаўскае кола»: Мір, Нясвіж і Паланечка, — гаворыць старшыня сельвыканкама. — Паводле легенды, той самы падземны ход, які так і не быў знойдзены гісторыкамі, звязвае Нясвіж не толькі з Мірскім замкам, але і з палацам у Паланечцы. Зразумела, што гэта адно з паданняў, якіх вакол найбагацейшага роду Вялікага Княства Літоўскага мноства. Але праўда ў тым, што гістарычна гэтыя палацы былі звязаны паміж сабой. Было б нядрэнна зноў гэта аднавіць. У нас ёсць распрацоўкі пра тое, які мог бы быць такі турыстычны маршрут. Але пакуль, на жаль, гэта справа будучыні.



На даху «сямейнага гнязда» Радзівілаў цяпер уюць гнёзды буслы.

Зрэшты, мясцовыя ўлады разумеюць, што ўласнік, верагодна, не захоча адкрываць у будынку палаца музей. Але гэта не самае галоўнае. У першую чаргу важна захаваць помнік архітэктуры. І «ўпісаць» яго ў сучаснасць. Напрыклад, выкарыстоўваючы патэнцыял загараднай княжацкай рэзідэнцыі, можна развіваць адзін з модных турыстычных кірункаў — агратурызм. Або стварыць дзіцячы лагер, які працуе на камерцыйнай аснове.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# Сімвал міру і яднання

**Сярод святыняў беларускай зямлі стала больш на адну рэліквію. У наступную суботу, 26 верасня, будзе прадстаўлены Тураўскі крыж у Мінску (у Мінскай духоўнай акадэміі адбудзецца прэзентацыя, а ў кафедральным саборы яго можна будзе ўбачыць на святочным богаслужэнні). Крыж аднавілі намаганнямі вялікага кола аднадумцаў. Пра гэта паведамілі журналістам падчас прэс-канферэнцыі «Захаванне культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа: узнаўленне напрастольнага крыжа Тураўскай епархіі XII—XIII стагоддзяў».**



— Гэта знакавая падзея для нашай краіны. Узноўлены крыж Тураўскай зямлі сёння з'яўляецца сімвалам вяртання, адраджэння духоўных традыцый. І сённяшняя падзея дае нагоду гаварыць і пра значэнне гэтага адраджэння, і пра тое, як яно можа і павінна далей праходзіць, — звярнуўся да прысутных **Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНЬЯМІН.** — Што датычыцца гісторыі ўзнаўлення Тураўскага крыжа, то яна вядзе адлік ад 1962 года, калі вядомы археолаг Пётр Лысенка знайшоў элементы святыні. Гэта былі чатыры свінцовыя выявы — Прасвятой Багародзіцы і трох святых. Вучоны выказаў здагадку, што гэтыя выявы мелі адносіны да напрастольнага крыжа Тураўскай епархіі XII—XIII стагоддзяў. І цяпер аднаўленая рэліквія сведчыць пра сувязь пакаленняў і разам з тым паказвае шлях у будучыню. Бо мы адраджаем нашы святыні для таго, каб пакінуць іх нашчадкам.

...У 2018 годзе Беларуская праваслаўная царква аб'явіла конкурс эскізных праектаў узнаўлення Тураўскага крыжа, і перамогу ў ім атрымаў праект Алены Андрушчанкі. А канцэпцыю рэліквіі падрыхтавала **старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы па царкоўным мастацтве, архітэктуры і рэстаўрацыі Марыя НЕЦВЯТАЕВА.** Зроблена два экзэмпляры Тураўскага крыжа. Адзін з іх будзе захоўвацца ў Акадэміі навук, а другі (з часцінкай крыжа, на якім быў укрыжаваны Хрыстос) перададуць у Тураўскі кафедральны сабор.

— Работа над праектам па ўзнаўленні Тураўскага крыжа пачалася тры гады таму. І гэта было нялёгка, бо асаблівасць сярэднявечнага мыслення ў тым, што чалавек, ствараючы нешта, адразу ўкладаў туды нейкі сэнс. Напрыклад, арнамент для людзей таго часу — гэта код. І ні адзін элемент Тураўскага крыжа не павінен быў стаць проста элементам аздаблянльным. Важна было захаваць багаслоўскі складнік, які ўзнік у XII стагоддзі, а таксама гістарычны кантэкст, — кажа Марыя Нецвятаева.

Свой значны ўклад у агульную справу зрабіў ААТ «Банк развіцця». Восенню мінулага года менавіта падтрымка праекта гэтай структурай дазволіла пачаць работу над вырабам крыжа. Вядома, што Банк развіцця з'яўляецца важным дзяржаўным інстытутам, які падтрымлівае розныя сферы, але пошук праектаў па развіцці сацыякультурнай сферы заўсёды быў і застаецца ў прыярытэце.

— З 2015 года Банк развіцця сфарміраваў і кожны год рэалізуе праграму «Культурная спадчына Беларусі», у межах якой выпускаюцца кнігі-альбомы, прысвечаныя славутым людзям нашай краіны. І вось такім праектам стала супрацоўніцтва па ўзнаўленні Тураўскага крыжа, які, на мой погляд, з'яўляецца адным з важных і сімвалічных аб'ектаў ідэнтычнасці Беларусі, — зазначыў **старшыня праўлення ААТ «Банк развіцця» Рэспублікі Беларусь Андрэй ЖЫШКЕВІЧ.** — І як у любым добрым пачынанні, тут сышліся для нас зоркі, каб задуманае здзейснілася. З аднаго боку, была актыўная жыццёвая пазіцыя Пятра Лысенкі і супрацоўнікаў Акадэміі навук, а з іншага — ідэя атрымала падтрымку з боку Беларускай праваслаўнай царквы і Сяргея Румаса, які ў той час узначальваў Банк развіцця. І мы сёння ўжо як пераемнікі на фінальнай стадыі гэтага шматгадовага і складанага працэсу па праве падзяляем радасць і гонар, што маем дачыненне да вялікай справы.

І зноў жа я адчуваю логіку і справядлівасць таго, што нашу калектыўную працу мы прэзентуем у гэтыя дні. Бо сёння Беларусі патрэбны сімвалы яднання, якія дапамогуць пераадолець раскол у грамадстве, гвалт і агрэсіўнае непрыманне альтэрнатыўных поглядаў. Я шчыра веру, што Тураўскі крыж, які вяртаецца на беларускія землі, дапаможа нам вярнуць супакаенне, дыялог і зберагчы мір для развіцця краіны. Няхай гэта будзе наш агульны ўклад у добрую справу.

**Алена ДРАПКО.**

На думку парламентарыя

**Валерый ВАРАНЕЦКІ:**

# «МЫ МУСІМ БЫЦЬ МОЦНЫЯ»

## Размова з дэпутатам беларускага парламента пра выклікі часу і неабходнасць умацавання нацыянальнага імунітэту



***— Валерый Іосіфавіч, што, на ваш погляд, зараз адбываецца з беларускім грамадствам?***

— Каб адказаць на гэта пытанне, неабходна зазірнуць у гісторыю. Усе гады незалежнасці нашай краіны ішоў недзе падспудны, недзе яўны працэс асэнсавання народам сябе, сваіх каранёў, вытокаў. Хто мы, адкуль наш род? Без гэтага немагчыма вызначаць свой шлях развіцця. Любому народу для гэтага патрабуецца час.

Беларусы апошнія стагоддзі былі пазбаўленыя сваёй дзяржаўнасці, але мелі ўсе падставы на яе прэтэндаваць. Нашы продкі пакінулі нам вялікую спадчыну, мы па праве можам ёй ганарыцца. Гэта веліч Полацкага, Турава-Пінскага, Наваградскага княстваў... На нашых землях былі напісаныя першыя летапісы, прысвечаныя гісторыі ўсходніх славян і нашай старажытнай літоўска-рускай дзяржавы, першыя рукапісныя Евангеллі — Тураўскае, Полацкае... Нельга не прыгадаць тут асветніцкую ролю Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Яна Гусоўскага, Сімяона Полацкага і іншых беларускіх гуманістаў, якія ўнеслі бясцэнны ўклад у развіццё беларускай культуры і еўрапейскай цывілізацыі ўвогуле. Нашы продкі змаглі аб'яднацца і стварыць у Сярэднявеччы адну з самых магутных дзяржаў Усходняй Еўропы — Вялікае Княства Літоўскае, якое паспяхова абараняла свае інтарэсы ў барацьбе і з мангола-татарамі, і з тэўтонцамі, і са шведамі, і з маскавітамі...

Народ наш здабыў у Сярэднявеччы сапраўдныя славу і веліч. Мы не так даўно святкавалі 500-годдзе Біблії Францыска Скарыны. Друкаванае Свяшчэннае Пісанне на нашых землях з'явілася намнога раней, чым ва ўсіх нашых суседзяў, нават раней, чым у французаў ці англічан.

Гэта гаворыць пра тое, што беларускі народ мае вялізны патэнцыял. І не толькі ў гуманітарнай сферы. Можна згадаць выдатнага вучонага ў галіне артылерыі Казіміра Семяновіча, працы якога сталі падмуркам для работ Цыялкоўскага і іншых еўрапейскіх вучоных.

На жаль, так склалася, што наша дзяржаўнасць на нейкім этапе яе развіцця аслабела. Гэта стала вынікам і ўнутраных памылак, і негатыўных знешніх уплываў, і войнаў, якія нам прыйшлося бесперапынна весці з нашымі суседзямі, абараняючы сваю Бацькаўшчыну. У выніку мы аказаліся ў складзе Рэчы Паспалітай, дзе з цягам часу набыў моц працэс паланізацыі нашай эліты, з афіцыйнага ўжытку была выцесненая беларуская мова, адбыўся ўціск усходняй галіны хрысціянства — праваслаўя... Наша эліта, урэшце адмовіўшыся ад спадчыны продкаў, па сутнасці, здрадзіла свайму народу і аддала перавагу служэнню іншай дзяржаве.

Падобнае, толькі ў адваротным напрамку, паўтарылася, калі мы сталі часткай Расійскай імперыі. Многія нашы выдатныя дзеячы пераехалі ў Санкт-Пецярбург, Маскву і служылі ўжо Расійскай імперыі, а народ застаўся сам па сабе. Таму, калі ў нашых суседзяў пачалі дзейнічаць нацыянальныя рухі, якія прывялі іх пасля развалу Расійскай імперыі да стварэння нацыянальных дзяржаў, беларусы запазніліся: мы былі аслабленыя, адарваныя ад сваіх каранёў... Гэтым, на мой погляд, у значнай ступені тлумачыцца тое, што нашы продкі не здолелі ўмацаваць і абараніць сваю нацыянальную дзяржаву, абвешчаную ў 1918 годзе. Безумоўна, гэта не магло не паўплываць і на тое, як і ў якім стане мы апынуліся ў складзе СССР, што з намі адбывалася там і з чым мы сустрэлі 90-я гады мінулага стагоддзя, калі адбыўся распад Саюза.

Стварыўшы сваю ўласную дзяржаву, беларускі народ (і ў першую чаргу наша моладзь) пачаў актыўна цікавіцца сваёй гісторыяй, культурай, шукаць адказы на пытанні: «Хто мы? Адкуль?» На нашых вачах адбываецца працэс вяртання да сябе, да сваіх каранёў, набывае сваё завяршэнне працэс кансалідацыі беларускай нацыі. А любая нацыя дакладна разумее, у якім доме і па якіх правілах жадае жыць, які парадак усталяваць, якія адносіны з суседзямі выбудоўваць...

Моладзь зыходзіць з таго, што ёй жыць у сваім родным беларускім доме. І ў яе ёсць сваё ўяўленне пра тое, які ён мусіць быць, каб у ім было камфортна жыць і працаваць, рэалізуючы тыя таленты, што дадзеныя нам ад Бога. Думаю, гэта — галоўнае. Людзі хочуць выбудаваць такі парадак, у якім ім будзе вольна і ўтульна, дзе яны змогуць сябе максімальна рэалізаваць у інтарэсах сваёй сям'і і свайго народа. Гэта няпросты працэс. Нехта ў гэтым асэнсаванні рушыў наперад, нехта затрымаўся... У розных людзей — рознае разуменне рэчаіснасці. Адсюль маецца пэўнае непаразуменне. Адны хочуць застацца ў той сістэме, да якой прывыклі, іншыя, і ў першую чаргу моладзь, хочуць пабудаваць новае, жадаюць перамен.

Дзяржава мусіла своечасова адчуць гэтыя кардынальныя змены ў свядомасці беларускага грамадства і адэкватна адрэагаваць на іх. Але з нейкіх прычын гэтага не адбылося. Сітуацыю абвастрылі эпідэмія каранавіруса і палітычная кампанія, у якія ўвайшло наша грамадства. Я маю на ўвазе парламенцкія і прэзідэнцкія выбары. У выніку маем тое, што маем.

Але вельмі важна, каб мы выйшлі з гэтых выпрабаванняў больш моцнымі, адзінымі, кансалідаванымі, з асэнсаваннем сваіх нацыянальных інтарэсаў. І калі здолеем гэта зрабіць, то, упэўнены, наша краіна і наш народ набудуць новае, магутнае дыханне, і мы зможам яшчэ здзівіць свет многімі навацыямі, якія будуць звязаныя і з арганізацыяй грамадскага жыцця, і з дзяржаўным будаўніцтвам, і з эканомікай, адукацыяй, навукай, культурай, сацыяльнай сферай...

Упэўнены, што мы, па меншай меры нашы дзеці, моладзь, — пакаленне, якое сёння найбольш актыўнае, — зможам стварыць канкурэнтаздольную краіну з лепшымі ўмовамі для жыцця, чым у нашых суседзяў. Наш народ, і ў першую чаргу наша моладзь, вельмі крэатыўны, творчы, патрыятычны, мы любім сваю зямлю і сваю краіну, як нам і завяшчалі нашы дзяды і прадзеды. Яны глядзяць на нас з нябёсаў і падтрымліваюць нас. Таму, думаю, усё ў выніку будзе добра. Але для гэтага патрэбны час.

***— Якія на гэтым шляху галоўныя пагрозы?***

— Ёсць унутраныя і знешнія пагрозы. Перш за ўсё, мы павінны і галавой, і сэрцам зразумець, што якія бы пагляды ні прытрымліваліся, да якіх бы палітычных плыняў не адносіліся, мы жывём у адной сям'і, у адным доме. Нам жыць у гэтым доме і ўладкоўваць яго. Таму я заўсёды адчувальна рэагую, калі сутыкаюся з канфрантацыйнай рыторыкай сярод нас, беларусаў. На жаль, яна сыходзіць з розных бакоў, але горш за ўсё, калі такая рыторыка гучыць з боку прадстаўнікоў улады, нашых ідэолагаў ці праўладных экспертаў. Бо ўлада на тое і ўлада, каб весці за сабой і падаваць прыклад.

У нас сёння, на жаль (гэта характэрна не толькі для нашага грамадства), вельмі шмат людзей думаюць катэгорыямі кшталту: «Вы за белых альбо за чырвоных?» І патрабуюць на складаныя пытанні простых адказаў: «так» або «не». І ніяк інакш! Гэта памылка. Так не бывае. Жыццё нашмат больш складанае і разнастайнае. Яно не бела-чорнае, яно мае ўсе колеры вясёлкі, як мінімум. І трэба цярпіма ставіцца да самых розных яго праяў. Уладзе і грамадству важна зразумець усю складанасць працэсаў, якія адбываюцца, асэнсаваць сябе, сысці ад супрацьстаяння, знайсці магчымасці для пошуку згоды, для дыялогу, для ўмацавання ўзаемаразумення. Зрэшты, для пакаяння і даравання. Тады мы выйдзем з гэтых выпрабаванняў нашмат больш моцнымі, чым былі да гэтага, альбо ёсць зараз. І гэта будзе залогам нашага паспяховага развіцця ў будучыні.

Другі вельмі важны для мяне як дыпламата аспект — міжнародны. Мы штодня сутыкаемся з праявамі нацыянальных інтарэсаў іншых дзяржаў. Нехта іх прасоўвае па ўсім свеце, нехта — у рэгіянальным разрэзе, і гэта зразумела, бо свет узаемазвязаны.

Вядома, тое, што адбываецца ў Беларусі, не можа не хваляваць у першую чаргу нашых суседзяў. Гісторыя мае ўласцівасць паўтарацца, і ў ёй можна знайсці адказы на многія пытанні, звязаныя ў тым ліку і са знешнепалітычнай дзейнасцю. У Сярэдня вякі наша старажытная дзяржава ВКЛ аказвала істотны ўплыў на ўсе краіны рэгіёна, наша роля была значная, упэўнены, што яна такой і будзе, гэта непазбежна. Калі нехта глядзіць на беларусаў паблажліва альбо зверху ўніз — робіць памылку. У нашага народа, нашай дзяржавы ёсць свае нацыянальныя інтарэсы і, як паказвае наша гісторыя, мы ўмеем і здольныя іх абараніць. Дастаткова ўспомніць вялікія перамогі нашых продкаў пад Сінімі Водамі, Грунвальдам, Кірхгольмам, Оршай... Але трэба разумець галоўнае — мы хочам жыць з усімі ў міры і сяброўстве, супрацоўнічаць, і каб нам не перашкаджалі будаваць свой дом, умацоўваць яго, рабіць лепшым.

Мы гатовыя канкурыраваць на міжнароднай арэне. Але зыходзім з таго, што, як мінімум, пры гэтым трэба паважаць і ўлічваць інтарэсы адзін аднаго, тым больш, калі гэта суседзі.

Зразумела, што міжнароднае жыццё нашмат больш складанае. Закон фарміравання знешняй палітыкі мае на ўвазе, што кожная дзяржава імкнецца ўмацаваць свае пазіцыі ў свеце і прасунуць уласныя інтарэсы, і там, дзе яна ў стане прасунуцца, яна прасоўваецца. Так уладкавана жыццё. І трэба разумець, што наша слабасць адразу ж будзе выкарыстаная суседзямі, каб вырашыць свае пытанні, рэалізаваць свае нацыянальныя інтарэсы ў рэгіёне за наш кошт. Таму мы павінны быць моцныя.

Тое, што сёння адбываецца адносна Беларусі, — адлюстраванне геапалітычнай барацьбы, якая абвастрылася вакол нашай краіны. Некаторыя нашы суседзі і геапалітычныя гульцы хацелі б выкарыстаць бягучы перыяд нестабільнасці ў нас у сваіх інтарэсах. І з гэтай мэтай яны падштурхоўваюць нас да тых рашэнняў, якія нас аслабляюць і аблягчаюць ім магчымасць прасоўваць свае інтарэсы ў нашай краіне. Такая суровая праўда жыцця. Гэта стварае пэўную пагрозу для Беларусі, для захавання нашага суверэнітэту. Таму нам сёння, і гэта адзін з самых сур'ёзных выклікаў, трэба выказаць сваю еднасць, разуменне таго, што адбываецца вакол нас, і, зыходзячы з гэтага, абараніць свае суверэнітэт і нацыянальныя інтарэсы.

***— Валерый Іосіфавіч, якая тут роля парламента — наколькі дзейсна ён можа абараніць суверэнітэт Беларусі?***

— Якраз парламент і можа быць такім стабілізатарам, які будзе забяспечваць неабходны баланс у грамадстве і яго кансалідацыю. Любая дзяржава імкнецца мець моцную эліту, але гэта эліта мусіць быць патрыятычнай. Каму як не парламенту стаць той пляцоўкай, на якой эліты, у першую чаргу, палітычныя, вядуць дыялог, дыскусіі адносна развіцця сваёй краіны. Але для гэтага парламент павінен быць моцны.

Я часта праводжу паралелі паміж сям'ёй і грамадствам, бо насамрэч, гэта проста розныя ўзроўні арганізацыі. Сям'я — ячэйка грамадства, і варта разглядаць клетку, каб зразумець, што адбываецца з арганізмам. У добрай сям'і заўсёды ідзе нармальны, узаемапаважлівы дыялог, абмен думкамі, выпрацоўка агульных рашэнняў, але ёсць і гаспадар, старэйшы, хто бярэ на сябе адказнасць за сям'ю. У гэтым бачу адказы на пытанні, якія звязаныя з уладкаваннем нашай дзяржавы і нашага грамадства.

Сёння мы павінны вельмі сур'ёзна падумаць над узмацненнем ролі, вагі і значэння парламента, але гэта не ўсё. Калі ў парламенце прысутнічаюць людзі з самымі рознымі поглядамі, падыходамі і разуменнем без апоры на свае каранёвыя, спаконвечныя, якарныя, калі хочаце, каштоўнасці, калі ў аснове не будзе разумення, што мы — нацыя, мы — беларусы, што гэта наша зямля, нам яе завяшчалі нашы дзяды і прадзеды і тут будуць жыць нашы дзеці і ўнукі, без моцнага нацыянальнага імунітэту мы не зможам ні забяспечыць стварэнне эфектыўна дзеючага заканадаўчага і прадстаўнічага інстытута нашай дзяржавы, ні гарантаваць стабільнасць, бяспеку і ўпэўненае дынамічнае развіццё краіны. Без гэтай апоры, без нацыянальнага імунітэту і патрыятызму парламент, па якой бы сістэме ні ішло яго фарміраванне, змогуць, выбачайце за гэта слова, «дзярбаніць» усе, хто захоча, у тым ліку і знешнія праціўнікі, у сваіх асобных мэтах. А інтарэс у парламента мусіць быць адзін — дабрабыт свайго народа і магутнасць сваёй дзяржавы.

Таму нам так неабходна нацыянальная кансалідацыя грамадства. Гэта тое, чым мы павінны займацца. Не ведаю, колькі ў нас яшчэ ёсць часу, але веру, што справімся з гэтай задачай, інакш не было б у Бога такога праекта, які звязаны з адраджэннем народа, культуры і дзяржавы пад назвай Рэспубліка Беларусь. Суверэнная незалежная Беларусь вельмі патрэбная і еўрапейскай цывілізацыі, і еўразійскай. Магчыма, без вольнай і моцнай Беларусі задума Божая ў гэтай часткі свету не можа быць рэалізаваная.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Слова чытачу

**«Крэда газеты на станоўчае, гуманітарнае развіццё, фарміраванне сумленных адносін паміж людзьмі — правільнае»**

**Аляксандр ЛАКОТКА, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:** «Ужо даўно склаліся добрыя традыцыі супрацоўніцтва са «Звяздой».



Першае, вельмі важна тое, што матэрыялы ў газеце публікуюцца на прыгожай беларускай мове. Па-другое, значная частка з іх прысвечана пытанням беларускай культуры, то-бок той сферы, з якой наш цэнтр працуе. Адметна, што ў газеце знаходзяць адлюстраванне памятныя даты з беларускай гісторыі — падзеі, юбілеі з дня нараджэння мастакоў, пісьменнікаў, дзеячаў культуры. Пастаянна друкуюцца ў «Звяздзе» паведамленні пра нашы канферэнцыі, перыядычна ладзяцца круглыя сталы, прысвечаныя пытанням гісторыі, культуры, мастацтва з удзелам супрацоўнікаў НАН. Карэспандэнты выдання наведваюць наш цэнтр, музей старажытнабеларускай культуры, працуюць з нашымі фалькларыстамі, этнографамі. Крэда газеты на станоўчае, гуманітарнае развіццё, фарміраванне сумленных адносін паміж людзьмі — правільнае.

Перыядычна ёсць матэрыялы, дыскусіі на старонках выдання, прысвечаныя захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, нематэрыяльнай, духоўнай культуры. У нашым цэнтры ёсць значныя праекты, пра якія варта было б расказаць чытачам. Напрыклад, з 2016 года з'явілася традыцыя праводзіць хоць бы раз на год буйныя міжнародныя навукова-культурныя мерапрыемствы. Так прайшлі, напрыклад, Міжнародны кангрэс, прысвечаны беларускаму народнаму касцюму, з вялікім прадстаўніцтвам замежных навукоўцаў, Міжнародны форум беларускай казкі, сёлета ў анлайн-фармаце правялі другі Міжнародны кангрэс беларускай культуры. На ім было прадстаўлена больш за 200 дакладаў з розных краін, выдадзены зборнік. А ў кастрычніку падвядзём вынікі рэспубліканскага конкурсу на найлепшы адвольны твор на беларускай мове.

# У ШЭСЦЬ ЦІ ЎСЁ Ж ТАКІ Ў СЕМ?

*У верасні найбольш гавораць пра школу. Дзеці паступова ўцягваюцца ў вучобу, атрымліваюць першыя адзнакі. Іх бацькі думаюць, чым бы яшчэ загрузіць сваіх нашчадкаў, каб не займаліся глупствам. Іншыя любяць пацікавіцца школьным жыццём. Мы ж з суседкай разважаем, у колькі лепш аддаваць дзяцей у першы клас.*

*Цётка Дануся (дзеці яе ўжо даўно дарослыя) кажа, што ўнучка пойдзе ў школу налета. Дзяўчынцы будзе амаль сем гадкоў. Яна, маўляў, усе літары ведае, чытаць і лічыць умее, таму трэба было ў шэсць аддаваць... Столькі размоў у апошні час пра ўзрост, у якім дзіця павінна ісці ў першы клас. Паміж матулямі — дык нават дыскусіі! У кожнай ёсць рацыянальнае зерне.*

*Я раскажу пра сябе. У школу пайшла ў сем гадоў з «хвосцікам». Калі мне было шэсць, маці (на хвілiначку, настаўніца пачатковых класаў!) вырашыла, што садзіцца за школьную парту мне яшчэ рана. І справа не ў тым, што я нічога не ведала. Скажу больш, у канцы мінулага стагоддзя ў школу ўвогуле мала хто ішоў падрыхтаваны: лічылася, што пісаць і чытаць павінны вучыць выключна настаўнікі. Я ж ужо добра чытала ў пяць гадоў (дзякуй бабулі-настаўніцы і яе сяброўцы, якія, сумяшчаючы прыемнае з карысным, праводзілі са мной час за кнігамі, калі матуля была на курсах павышэння кваліфікацыі). Чаму ж не пусцілі раней у школу? Маці падалося, што мяне, на той час маленькую ростам і вельмі сціплую дзяўчынку, проста «затопчуць» мае будучыя аднакласнікі. Праўда, была і больш сур'ёзная прычына: вочы. З трох гадоў я насіла акуляры з адным заклееным шкельцам — касавокасць. Трэба было яшчэ пабергчы зрок, а сеўшы за парту, як вы разумееце, гэта амаль немагчыма.*

*І маці не прагадала. У школу я пайшла ў сем, праз некалькі гадоў акуляры знялі (урачы нават не паверылі, што абышлося без хірургічнага ўмяшання), і я стала амаль выдатніцай: скончыць школу з залатым медалём перашкодзілі матэматыка і... фізкультура. А яшчэ ў маім класе я знайшла сапраўдных сябровак, з якімі дагэтуль разам, як кажуць, і ў горы, і ў радасці.*

*Такім чынам, у колькі аддаваць дзіця ў школу, рашаць павінна кожная канкрэтная сям'я. Усё, як кажуць, індывідуальна. Адно дзіцятка ўжо ў чатыры гадкі ведае ўвесь алфавіт, а іншае і ў чацвёртым класе не можа расказаць элементарную казку (пра рэпку, курачку Рабу і іншыя). Але гэта хутчэй выключэнне. Сёння стала модна вадзіць дашкольнікаў на курсы па падрыхтоўцы да школы, займацца з рэпетытарам. Сучасныя дзеці раней вучацца чытаць і лічыць, чым асвойваюць, прабачце, гаршчок.*

*Толькі быць не па ўзросце развітым не заўсёды добра. Па сабе ведаю. Пакуль мае аднакласнікі вывучалі літару «б», я (вядома, з дазволу настаўніцы) ужо гартала «Буквар» у раёне літар «м»-«н». І не адчувала сябе самай разумнай. Мне было вельмі нецікава адной вывучаць алфавіт. І ў той жа час сумна было з аднакласнікамі: яны не ведалі элементарных, як мне тады здавалася, рэчаў! А які сорам я адчувала, калі маці прыводзіла мяне да сябе на ўрок, каб я, першакласніца, прадэманстравала яе вучням (трэці клас!), як трэба чытаць.*

*Ва ўсім павінна быць мера. Калі дзіця падрыхтаванае, навошта чакаць яшчэ год, каб аддаць яго ў школу?! Калі ж справа ў стане здароўя, аб'ектыўных сямейных абставінах (напрыклад, толькі нарадзілася другое дзіця і непажадана, каб старэйшае прыносіла са школы інфекцыі), можна годзік пасядзець і дома. Кожны вырашае сам. Галоўнае, каб гэта было на карысць дзіцяці.*

**Вераніка КАНЮТА.**


# Сямейная газета

Выпуск № 18 (154)


Тыя, хто побач

**Марына МУЛЯВІНА:**

# «Пасля разводу бацькі заставаліся блізкімі людзьмі»

## Дачка галоўнага «песняра» распавяла пра сямейныя традыцыі

**Як гэта — быць дачкой аднаго з самых знакамітых музыкантаў Савецкага Саюза? Як складвалася яго сямейнае жыццё? Як развод Лідзіі Кармальскай і Уладзіміра Мулявіна паўплываў на лёсы іншых людзей? Пра гэта і многае іншае расказала старэйшая дачка народнага артыста СССР, заснавальніка ансамбля «Песняры» Уладзіміра Мулявіна Марына. Сама яна ўжо 41 год жыве ў шчаслівым шлюбе.**

***— Лідзія Кармальская і Уладзімір Мулявін актыўна гастралявалі, часта пакідалі вас на бабулю. Напэўна, сумавалі па маме і тату?***

— Вядома, сумавала. Але калі яны прыязджалі, проста млела ад шчасця. У СССР гастролі доўжыліся месяцамі, часам яны прыязджалі, каб толькі ўзяць вопратку па сезоне. І ўсё роўна няхай рэдка бачыліся, я ведала, адчувала, як яны мяне любяць. Калі з'язджалі, пакідалі мяне на бабулю па лініі мамы — гэта таксама вельмі значны чалавек у маім жыцці. Менавіта бабуляй закладзены шматлікія сямейныя традыцыі: мы да гэтага часу лепім пельмені, ладзім агульныя абеды ў выхадныя.


*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*




Вялікая сям'я. *Ніжні рад:* Алег ГУТАР (муж сястры), унук Міша, Вольга і яе дачка Ксенія, сабака Перац, Марына і Анатоль, *верхні рад:* старэйшы сын Павел, хросны ўнука Глеб, сын Іван і яго жонка Ганна.



Бабуля Вольга з любімымі ўнукамі.

Праект «СГ»

# РАДАСЦІ, ЯКІХ МАГЛО І НЕ БЫЦЬ

## Як бяздзетнай пары завесці дзіця

**У гэтым праекце мы пазнаёмім вас з бяздзетнымі парамі, якія хацелі, але праз стан свайго здароўя не маглі мець дзяцей. Гэта будуць тры гісторыі, якія дапамогуць людзям у аналагічнай сітуацыі правільна ацаніць свае магчымасці, справіцца са сваімі страхамі і атрымаць неабходную інфармацыю, што датычыцца ўсынаўлення, ЭКА і сурагатнага мацярынства ў нашай краіне.**

**Першая гісторыя пра сям'ю, якая амаль трыццаць гадоў таму ўдачарыла дзяўчынку. Маці Вольга Мікалаеўна КАХНЮК і прыёмная дачка Ала прыгадалі час адаптацыі маленькай Алы да сям'і і расказалі пра тое, як справіліся з прадузятасцю грамадства і сталі роднымі адна адной.**


*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Меркаванне

# «У самым небяспечным становішчы могуць апынуцца менавіта дзеці...»

**Руслан АБРАМЧЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама:**



— Выхад з дзіцем ці выхад непаўналетніх на несанкцыянаваныя мерапрыемствы часам падаюцца так: ішоў міма ці ішоў гуляць з малым. Але хачу яшчэ раз нагадаць, што ўдзел у несанкцыянаваных акцыях можа мець даволі дрэнныя наступствы. І тут адразу ж відавочныя два аспекты. З аднаго боку, састаў правапарушэння, з другога — пагроза здароўю дзяцей, у тым ліку псіхічнаму.

Калі на падобныя мерапрыемствы выходзяць дзеці старэйшыя за 16 гадоў, яны нясуць поўную адміністрацыйную адказнасць у выглядзе штрафу. Напрыклад, у жнівні-верасні ў камісіі па справах непаўналетніх вобласці на разгляд паступіла 23 пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях пры правядзенні масавых мерапрыемстваў. Па гэтых пратаколах вядзецца адміністрацыйны працэс. Калі віна падлеткаў будзе даказана, ім пагражае папярэджанне альбо штраф у памеры да 30 базавых велічынь. Да таго ж з імі будуць праводзіць прафілактычную работу.

Калі выходзяць дзеці, якія не дасягнулі такога ўзросту, адказнасць за іх нясуць бацькі. Яны падпадаюць пад іншую фармуліроўку — невыкананне абавязкаў па выхаванні непаўналетніх. Гэта можа быць штраф ці папярэджанне. Ва ўсякім выпадку, адміністрацыйная адказнасць застаецца ў біяграфіі бацькоў — і, што яшчэ больш крыўдна, іх дзяцей.

Але ўсё гэта не ідзе ні ў якое параўнанне з уплывам пратэсных акцый на псіхіку дзіцяці, на яго далейшыя ўчынкі. Бо непаўналетнія яшчэ не маюць механізмаў псіхалагічнай абароны, слаба ўяўляюць, як рэагаваць на сітуацыю. Некаторыя дзеці інтуітыўна спрабуюць пазбегнуць такіх экстрэмальных мерапрыемстваў. Але нічога не могуць зрабіць і вымушаныя падпарадкавацца бацькам, якія прывялі іх на несанкцыянаваныя акцыі. Асабліва балюча глядзець, калі дзеці плачуць, хочуць сысці, а бацькі кажуць: «Стой тут!» Якія ўражанні застануцца ў дзіцяці пасля гэтага мерапрыемства? Вядома, адмоўныя. Прычым негатыўныя наступствы могуць праявіцца як адразу, так і праз многія гады.

Ёсць і такі небяспечны аспект. Уцягванне ў эмацыянальна напружаны натоўп можа падштурхнуць да групавых супрацьпраўных дзеянняў і выліцца ў нешта большае. Ёсць небяспека атрымаць траўмы. Калі натоўп пачынае рэзка рухацца, людзі ў ім могуць пакалечыцца, у тым ліку і дзеці. Таму бацькам трэба двойчы падумаць, перш чым цягнуць дзяцей на такія мерапрыемствы.

Варта трымаць у галаве такія пытанні: дзе будзе знаходзіцца маё дзіця і што станецца з ім, калі мяне затрымаюць, што будзе з дзіцем, калі я не вярнуся дадому? А такія вынікі падчас несанкцыянаваных акцый вельмі верагодныя. Таму бацькі, ідучы на іх, павінны разумець, што механізмы супрацьдзеяння з боку супрацоўнікаў праваахоўных органаў могуць прывесці да такіх наступстваў.

Другая сітуацыя — з-за пратэстаў перакрываецца вуліца, транспарт не курсіруе, дзеці не могуць трапіць у свой мікрараён. Многія прыязджаюць на заняткі з дальніх мікрараёнаў, напрыклад з Альшанкі, і не могуць дабрацца дадому. Гэта таксама стрэс і для іх, і для бацькоў, якія іх чакаюць.

Таму трэба ўзважана адносіцца да формаў выказвання свайго меркавання, а галоўнае — прытрымлівацца закона і не ўцягваць непаўналетніх у несанкцыянаваныя акцыі. Калі мы бачым, што дзіця з-за недагляду бацькоў пастаянна здзяйсняе нейкія супрацьпраўныя ўчынкі, гэта можа стаць адным з крытэрыяў для надання сям'і статусу сацыяльна небяспечнай. Гэтае пытанне разглядаецца камісіямі па справах непаўналетніх. У дадзеным выпадку прыцягненне да адказнасці за ўдзел у акцыях бацькоў дае падставу звярнуць увагу на сям'ю. Сюды абавязкова прыйдуць з праверкай на прадмет таго, ці задавальняюцца асноўныя жыццёвыя патрэбы непаўналетняга. Бывае, што такі падыход адыгрывае сваю ролю: бацькі пачынаюць задумвацца. Бо хто яшчэ так абароніць сваё дзіця ад бяды, як не яны?

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Дзяржава забяспечыць малым ахову

**Людміла ПАДЛУЖНАЯ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**



— Калі я бачу на мітынгах маленькіх дзяцей, сэрца абліваецца крывёй. Мне многія задавалі пытанне, ці згодная я з тым, што бацькоў неабходна караць за тое, што бяруць з сабой малых на акцыі пратэсту. Казала раней, кажу і цяпер: дзецям не месца на падобнага роду мерапрыемствах. Гэта не вечарына каля сваіх пад'ездаў з гарбатай і печывам — гэта вялізны натоўп людзей! На несанкцыянаваных акцыях з такой колькасцю людзей назапашваецца шмат агрэсіі. Дастаткова неасцярожнага руху, рэзкага гуку, і можа здарыцца другая «Няміга». Мы ўсе памятаем наступствы. Бацькі гэтага хочуць? Каго потым будуць вінаваціць?

Як маці, як кіраўнік установы дашкольнай адукацыі ў мінулым, я цалкам згодная з прадстаўніком Генеральнай пракуратуры Аляксеем Падвойскім, які выступіў з афіцыйным папярэджаннем аб тым, што кожны выпадак будзе кваліфікавацца органамі апекі і папячыцельства як пытанне аб знаходжанні дзіцяці ў сацыяльна небяспечным становішчы. Калі бацькі не могуць забяспечыць ахову свайму дзіцяці, значыць, рабіць гэта будзе дзяржава. І яшчэ пра псіхатраўміруючы складнік. Адна маці вельмі эмацыянальна распавядала, як яе дзіця баіцца чорных масак. Дарагія мае бацькі, усё, чаго баіцца дзіця, — гэта мы з вамі, нашы ўчынкі і нашы размовы. Вы дапускаеце, што дзіця становіцца сведкам жорсткасці, і вашай у тым ліку, становіцца ўцягнутым у цяперашнюю сітуацыю. І «разбачыць» гэта потым, без дапамогі спецыяліста, у яго не атрымаецца.

Скарыстаюся магчымасцю звярнуцца да ўсіх бацькоў: беражыце самае лепшае, самае каштоўнае, што ў вас ёсць, — вашых і нашых дзяцей!

Незламаныя лёсы

# УРАТАВАЦЬ НЕЛЬГА СТРАЦІЦЬ

**Крызіс падлеткавага ўзросту з яго пошукамі сябе, пратэстамі супраць наваколля, неразуменнем, што адбываецца ў тваім унутраным свеце і чаго прагнуць сэрца і розум, сам па сабе — цяжкі перыяд. А калі пры гэтым адсутнічае падтрымка з боку родных — дзецям яшчэ цяжэй, і паратунак яны шукаюць у цыгарэтах, выпіўцы, хуліганстве, болю — так яны «крычаць» аб неабходнасці дапамогі і шукаюць для сябе бяспекі.**



Менавіта ў гэты час падлетка можна страціць ці ўратаваць. Прычым ратаваць павінны не людзі ў форме, бо часта з месцаў пазбаўлення волі шляху назад ужо не існуе. Не згубіцца ў гэтым свеце ўжо амаль дарослым дзецям дапамагаюць спецыялісты па аднаўленчай медыяцыі. Псіхалагічную і прававую дапамогу падлеткам, якія знаходзяцца ў канфлікце з законам, аказваюць у сацыяльна-педагагічных цэнтрах Баранавіч, Салігорска, Мінскім раёне і ў Ленінскім раёне сталіцы. Яны — тыя людзі, якім удаецца стварыць умовы для паразумення паміж «бунтаўшчыкамі», іх сваякамі і тымі, хто ўжо паспеў пацярпець ад недзіцячых свавольстваў падлеткаў. Шляхам пагаднення, спробаў загладзіць нанесеную шкоду, нават прабачэння і ўсведамлення хуліганамі таго, што яны здзейснілі, проста ратуецца лёс малалетняга, які пазней стане паўнавартасным дарослым чалавекам, незламаным і нескалечаным. У гэтай рубрыцы мы будзем расказваць вам гісторыі, героі якіх ўратаваліся з дапамогай такіх спецыялістаў.

## «ХРЭСТАМАТЫЙНЫ» ПАДЛЕТАК

Ва ўчарашняга падлетка Ангеліны — размеранае сямейнае жыццё: пакуль муж на рабоце, яна гатуе, пячэ булачкі, прыбірае кватэру. Нованароджаная дачка ледзьве споўніўся месяц, аднак дзяўчына абыходзіцца з немаўлём упэўнена, нібыта вопытная матуля — ведае, як карміць, падтрымліваць галоўку, як пераапранаць. У сям'і сваіх бацькоў Ангеліна была старэйшая з шасці дзяцей, гэткім жа раннім дзіцем у сваёй матулі, якая цяпер, у свае 34 гады, стала бабуляй.

На дзяўчыне было шмат абавязкаў па выхаванні малодшых братоў і сясцёр. Калі брат не паступіў у пяты клас гімназіі, ёй таксама прыйшлося перайсці ў іншую школу, каб праводзіць яго і малодшых сясцёр-пагодкаў на заняткі і дадому пасля ўрокаў. Ангеліне падабалася вучыцца ў гімназіі, у яе быў любімы настаўнік і прадмет — англійская мова, аднак інтарэсы сям'і заўжды былі вышэйшыя за яе ўласныя.

Пераходны ўзрост дзяўчынкі пачаўся для сям'і раптоўна. У гэты перыяд усе падлеткі становяцца цяжкія, кожны па-свойму, таму што перад імі стаіць складаная задача — здзейсніць пераход ад дзіцяці да дарослага чалавека. На жаль, большасць сем'яў гэты перыяд пражываюць балюча, страчваецца давер, разбураюцца сувязі. Калі з паслухмянай памочніцы Ангелінаператварылася ў хрэстаматыйнага цяжкога падлетка, яе маці было складана прыняць гэтыя перамены. Дзяўчынка больш не хацела сядзець дома і даглядаць малодшых дзяцей, ёй хацелася бавіць час з сябрамі, рабіць усё, што робяць яе равеснікі. Следам за сваім першым каханнем Ангеліна пайшла на бокс, падлеткі сталі разам хадзіць да аднаго трэнера. У каледжы яна ўспыхвала нават ад маленькай іскры, адразу кідалася ў бойку з аднакурсніцамі. Аднойчы справа дайшла ажно да бальніцы.

У адказ на бацькоўскія забароны Ангеліна стала ўцякаць з дому. Яе шукалі з міліцыяй, часам па некалькі дзён. Неаднойчы ў навінах публікавалі прыкметы дзяўчыны, заклікі аб дапамозе ў вышуку.

Гэта толькі пагоршыла адносіны з матуляй: дома былі скандалы, якія даходзілі нават да боек. Ангеліна перастала наведваць каледж. Жыла па некалькі месяцаў то ў бабулі, то ў прытулку. Некалькі разоў у яе фіксавалі розныя пашкоджанні: яна раніла сябе адкрыта, каб было бачна. І гэта быў крык аб дапамозе, якога ніхто не чуў.

## КРЫТЫЧНАЯ КРОПКА

Адмова ў падтрымцы з боку родных — самае складанае, з чым могуць сутыкнуцца падлеткі ў гэты перыяд. Нягледзячы на знешнюю рэзкасць і грубасць, па сутнасці, гэта ўсё яшчэ дзеці: няшчасныя, трывожныя, акружаныя непрыяцем. Самае важнае для іх зараз — адчуць сябе ў бяспецы, кажа Людміла, спецыяліст па аднаўленчай медыяцыі, якая дапамагала дзяўчыне разабрацца з яе праблемамі. У пошуках бяспечнага месца Ангеліна «прыйшла» ў адносіны з хлопцам, з якім пазней стварыла сям'ю і нарадзіла дзіця.

Падчас цяжарнасці сітуацыя паміж Ангелінай і яе маці дасягнула крытычнай кропкі, калі ўжо ніхто не мог кантраляваць агрэсію, у любы момант магла здарыцца трагедыя. Сацыяльныя службы параілі маці падлетка звярнуцца да спецыялістаў па медыяцыі.

— *Калі я пазнаёмілася з гэтай сям'ёй, адносіны маці з дачкой былі вельмі складаныя,* — узгадвае Людміла. — *Кожная іх сустрэча заканчвалася сваркай, бойкай ці выклікам міліцыі. У той момант адна са спраў, дзе маці выступала пацярпелай (яна падала на Ангеліну ў суд), была якраз у судзе. Агульную сустрэчу арганізаваць не атрымалася, таму мы праводзілі так званую чаўночную медыяцыю, працуючы па чарзе з абодвума бакамі канфлікту.*

Канешне, за некалькі сустрэч немагчыма аднавіць тое, што разбуралася гадамі, аднак градус спрэчкі ўдалося значна знізіць. Нядаўна Ангеліна прыязджала ў госці да бацькоў разам са сваёй дачкой. Ёй вельмі сумна ад таго, наколькі аддалілася яна ад маці і бацькі, ад таго, што ў сям'і, дзе прайшло яе дзяцінства, яна стала амаль чужой. І ёй шкада, што на яе вяселлі з іх не было нікога — самым блізкім чалавекам для яе была і застаецца бабуля.

## «МАЁ ЖЫЦЦЁ — У ЁЙ!»

Цяпер у Ангеліны ўласная сям'я, яна вядзе гаспадарку і даглядае дачку Ганначку. Са сваякамі мужа ў яе складваюцца добрыя адносіны. Гэта самае бяспечнае месца, якое яна змагла знайсці. Аднак, азіраючыся на сваю сямейную гісторыю, маладая матуля непакоіцца за дачку.

— *Я хачу быць найлепшай матуляй для майго дзіцяці. Самым блізкім чалавекам, з якім яна зможа дзяліцца і добрым, і кепскім. Я буду размаўляць з ёй і старацца зразумець. Не хачу, каб у яе было, як у мяне. Усё маё жыццё зараз у ёй.*

**Алена СЯМЁНАВА.**

# «Пасля разводу бацькі заставаліся блізкімі людзьмі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Цікава, а ці можна было ў часы вашага дзяцінства спакойна прайсціся па вуліцы побач з Уладзімірам Мулявіным? Напэўна, ад прыхільнікаў праходу не было.***

— Вырвацца кудысьці з бацькамі было цяжка, але не з-за прыхільнікаў, а з-за занятасці. Але з татам часта бывалі ў цырку — у яго там былі свае справы з музыкантамі аркестра, а я сядзела побач з імі і глядзела прадстаўленне. На вуліцы, вядома, на яго ўвагу звярталі, але прыхільнікі паводзілі сябе стрымана — бачылі, што ён з дзіцем.

***— На нашы часы сказалі б, што вы — прадстаўнік «залатой моладзі». А тады гэта адчувалася?***

— Бацькі, асабліва тата, мяне песцілі. З гастроляў прывозілі вельмі прыгожыя рэчы. Цяпер смешна пра гэта казаць, але так, я была «крутой» дзяўчынкай — лёгка частавала аднакласнікаў жвачкай. Вядома, сваё кола зносін было, у нейкай меры яно фарміравалася сям'ёй — дзеці сяброў бацькоў, аднакласнікі. Я шчаслівы чалавек — мае сяброўкі засталіся з дзяцінства.

***— Ці былі нейкія прадвеснікі разводу бацькоў?***

— Абсалютна ніякіх. Тым больш гэта адбылося адразу пасля нараджэння Валодзі-малодшага, а тата так марыў пра сына. Для мяне проста патухла святло, калі бацькі разышліся. Я — татава дачка. Тады і моцна схуднела, і прытомнасць страчвала. Ужо потым, калі стала дарослай, мы шмат гаварылі з татам на розныя тэмы. У тым ліку аб разводах. Другі яго шлюб быў жа зусім нядоўгі. Тата не быў аднолюбам. І разам з тым ён вельмі сумленны. Вось як некаторыя жывуць? Ёсць сям'я, і паралельна ёсць раманы. А тата — не: закахаўся — ажэніцца. Неяк ён сказаў, што ад такіх, як мая мама, не сыходзяць... Але гэта разуменне з'явілася потым, а калі разводзіўся, можа, нават яму хацелася здзейсніць нейкі дарослы ўчынак? Па жыцці мой тата — дзіця па натуры, як кіраўнік «Песняроў» — зусім іншы чалавек. Да гэтага часу думаю, што той развод змяніў жыццё не толькі нашай сям'і: вакол стала шмат няшчасных людзей, ды і ў «Песняроў» з'явілася некалькі саставаў. Мама ж таксама паспрыяла поспеху калектыву, а музыканты называлі яе Маці.

***— Сяброўка вашай мамы, спявачка Нэлі Багуслаўская, расказала мне, што лекары забаранялі Лідзіі нараджаць другое дзіця. Вось думаю: гэта ж якая павінна быць моц кахання, каб рызыкнуць сваім здароўем, а то і жыццём, каб спраўдзіць мару мужа, — нарадзіць сына?!***



Вяселле Марыны і Анатоля.

— Гэта была неверагодная моц. Ведаеце, і пасля разводу бацькі заставаліся блізкімі людзьмі. Не магу сказаць, што тата нас кінуў. Хоць часцей мы яго, вядома, бачылі па тэлевізары. Зараз у Мінску я жыву ў кватэры бацькоў. Пасля разводу тата пабудаваў два кааператыва — па адным у кожным новым шлюбе, але нейк пры гэтым заставаўся прапісаным на вуліцы Сурганава. Ён выпісаўся адтуль літаральна за два-тры гады да смерці. У бальніцу пасля аварыі ён трапіў, калі мы рабілі рамонт. Тады была ўпэўненая, што тата выжыве, але прадугледжвала, што перасоўвацца будзе ўсё-ткі ў вазку, таму ўвесь рамонт быў з разлікам на тое, каб яму было зручна. А ён казаў: «Выпішуся, прыеду дадому, пагляджу, што ты там нарабіла».

***— Марына, па сутнасці, вы гадавалі свайго малодшага брата Валодзю.***

— Так, я заўсёды кажу, што ён — маё першае дзіця. Мама працавала, таму няньчыла брата я, так склалася, што ўсе хатнія справы — прыбраць, прыгатаваць — былі на мне з 12 гадоў. Валодзя — і самы вялікі мой боль з-за таго, што так трагічна склаўся яго лёс. Вова быў таленавітым музыкантам, тата сам прызнаваўся, што сын яго перайграў яшчэ падчас навучання ў спецыяльнай музычнай школе пры кансерваторыі. Але бацька ніяк не дапамагаў яму ў кар'еры. Не ведаю, чаму. Можа, музыкальная рэўнасць, можа, пачуццё віны, што адразу пасля яго нараджэння сышоў з сям'і...

***— Гэта значыць, юнацтва ў вас была не як ва ўсіх — без дыскатэк і іншых забаў?***

— Не, што вы. Не так усё беспрасветна. І сяброўкі былі, і дыскатэкі — напэўна, толькі больш дазіравана, чым у іншых. Прыхільнікі таксама былі. Першы раз мне зрабілі прапанову ў 17 гадоў. Я адмовілася, таму што не было пачуццяў да гэтага чалавека.

***— А са сваім мужам як пазнаёміліся?***

— Цалкам выпадкова. Разам з сяброўкай заехалі да яе знаёмага аддаць доўг, а ў яго дома быў прыяцель. Так мы пазнаёміліся. Мне вельмі падабаецца акцёр Віталь Саломін, і калі ў Толі на твары я ўбачыла «саломінскую» радзімку, проста растала. Мы пачалі сустракацца.

***— Як прайшло знаёмства бацькоў з вашым жаніхом?***

— Мама адразу яго прыняла, а вось тата быў незадаволены, што падчас вяселля я ўжо была цяжарная. Але потым убачыў, што ў нас усё добра складваецца, таксама памякчэў.

***— Ваш муж мае прафесійнае стаўленне да музыкі?***

— Ён інжынер. У свой час вучыўся ў музычнай школе па класе баяна. А потым яго інструмент падарылі «Песнярам» для выканання «Волагды».

***— Паміж вашымі сынамі розніца 10 гадоў. Так атрымалася, ці вы планавалі другое дзіця?***

— Мы заўсёды хацелі дваіх дзяцей. І да нараджэння малодшага сур'ёзна рыхтаваліся, муж нават кінуў курыць. Мне наогул падабаецца такая розніца ва ўзросце дзяцей, таму што бацькоўства ў 20 гадоў і ў 30 — гэта зусім розны вопыт.

***— А як хлапчукі сябе паводзілі? Сябравалі або сапернічалі?***

— Малодшы пастаянна правакаваў канфлікты. І гэта, напэўна, натуральна. Самае галоўнае, якімі яны выраслі. Зараз, калі ім 40 і 30 гадоў, браты кожную раніцу стэлефаноўваюцца. Яны вельмі хораша сябруюць. Заўсёды старалася выхаваць у іх пачуццё сям'і, нават клана, таму што гэта выдатна, калі ёсць вялікая дружная сям'я. Мая мама заўсёды казала: нічога не трымайце ў сабе, усё прагаворвайце. Вось і я гэтаму вучу дзяцей, унукаў. У нас прынята дзяліцца планамі, перажываннямі, сумненнямі. Гэта вельмі важна, калі ёсць каму расказаць пра тое, што хвалюе, і ведаць, што цябе пачуюць і падтрымаюць.

***— Ва Уладзіміра Георгіевіча ад трох шлюбаў чацвёра дзяцей: вы і Валодзя-малодшы ад Лідзіі Кармальскай, Вольга — ад шлюбу са Святланай Слізскай, Валерый — ад шлюбу са Святланай Пенкінай. Гэта таксама сям'я? Вы маеце зносіны?***

— На шчасце, у нашай сям'і не было такога, каб мама забараняла мець зносіны з дзецьмі ад іншых шлюбаў таты. Маленькага Валеру мы дапамагалі гадаваць — нам часта яго пакідалі, тым больш што жылі мы з татам па суседстве.

З Вольгай і яе сям'ёй мы сябруем. Нашы дзеці адзін у аднаго хросныя. Валера, можа, таму што самы малады сярод нас, трымаецца трошкі адасоблена. На мой погляд, як бы ні склалася жыццё бацькоў, на зносінах дзяцей гэта не павінна адбівацца. Таму мы павінны сябраваць, разам трымацца, разам прымаць нейкія рашэнні, якія датычацца памяці таты.

***— Кажуць, што дзеці паўтараюць лёс бацькоў. У вас моцная сям'я, якой ужо...***

— 41 год. Думаю, што мая сям'я — гэта праца над памылкамі бацькоў. Нашы сыны жартуюць: вы да гэтага часу ходзіце, узяўшыся за рукі. Нават калі я ладжу дзявочнік з сяброўкамі, яны просяць: няхай і Толя будзе з намі. Гэта значыць, ён і муж, і сябар. Вядома, праз 40 гадоў няма таго запалу, які быў у маладосці. Зараз іншае: узаемная цікавасць, павага. Вось ён ходзіць па садзе на нашым хутары, збірае яблыкі, я гляджу з акенца і проста любуюся ім, думаю, як добра, што ён побач.

***— Ці задаволены вы сваімі нявесткамі?***

— Вядома! Добрыя дзяўчынкі, любяць нашых сыноў — пра што яшчэ можна марыць? Праўда, калі «ўручала» іх нявесткам, прасіла: не папсуйце хлопцаў. Яны ў нас умеюць усё: гатаваць, прыбіраць, прасаваць кашулі.

***— А ў вашай сям'і было размеркаванне абавязкаў? Напрыклад, жонка мые посуд, смецце выносіць муж...***

— Асноўная хатняя нагрузка была на мне, але ўсе мужчыны лёгка маглі падмяніць, тым больш — дапамагчы. Так склалася, што па крамах у асноўным ездзіць Толя, я люблю рабіць пакупкі на Камароўцы. Побыт ніколі не быў нейкай невырашальнай праблемай.

***— Як распараджаецеся фінансамі?***



Лідзія Кармальская з дзецьмі Марынай і Валодзем.

— Гэта яшчэ з сям'і бацькоў пайшло. У іх была скарбонка, у якой захоўвалі грошы. Асобна тата збіраў на інструмент. А сямейныя грошы — трэба схадзіць па прадукты — узяў са скрыначкі. Буйныя пакупкі плануюцца загадзя. Мы з мужам зарплаты таксама так складвалі. Зараз ужо наяўныя замянілі карткі. Але традыцыя разам абмяркоўваць выдаткі захавалася.

***— Вы казалі, што наладжваеце «дзень бабулі і дзеда» для ўнукаў. Што гэта такое?***

— Гэта калі ўнукаў, у нас іх трое: Лідачка, Ульяна і Міша, дзеці прывозяць да нас. Я лічу, што гэта павінна быць не толькі тады, калі бацькам трэба кудысьці па справах, але і проста, каб яны маглі пабыць удвух, крышку адпачыць, вальней сябе адчуць.

***— Марына, раскажыце, як з'явілася ідэя напісаць кнігу пра вашых бацькоў?***

— Калі не стала таты, расійскае выдавецтва практычна адразу прапанавала мне апублікаваць іх лісты з невялікімі каментарыямі. Ведаеце, я не была гатовая ўсё гэта вынесці на публіку. Мне здавалася, што такім чынам я «аддам» сваю сям'ю ўсім. Усур'ёз пра кнігу я пачала думаць, калі нарадзіўся першы ўнук. Мне хацелася, каб ён ведаў гісторыю сям'і. Доўга выношвала гэтую думку, а потым звярнулася да сваёй сяброўкі — музыказнаўцы Вольгі Брылон, каб яна мне дапамагла. Вольга пачала рабіць запыты, працаваць у архівах, і мы зразумелі, што да сямейнай гісторыі дадаецца і прафесійная. Так у нас у суаўтарстве атрымалася кніга «Уладзімір Мулявін і Лідзія Кармальская. Недасказанае...» Яна пра маіх бацькоў і, як мне здаецца, пра самы паспяховы перыяд «Песняроў».

***— Вядома, што будзе здымацца міні-серыял аб вашым бацьку...***

— У Расіі ўжо ёсць двухсерыйны дакументальны фільм пра «Песняроў», але ён пакуль не агучаны. Планавалі зрабіць да 50-годдзя ансамбля, але цяпер, думаю, хоць бы паспелі да 80-годдзя таты. Што да беларускага серыяла, тут сабралася вельмі добрая каманда, і я ўпэўненая, што атрымаецца годная работа.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота з асабістага архіва Марыны Мулявінай.**



Уладзімір Мулявін з жонкай Лідзіяй і дачкой Марынай.

# РАДАСЦІ, ЯКІХ МАГЛО І НЕ БЫЦЬ

## Перад Вялікаднем

Наогул Вольга хацела хлопчыка. Яна — жанчына з характарам, таму не ўяўляла сябе маці дзяўчынкі. Працавала таваразнаўцам у адной краме, якая, як тады было прынята, узяла шэфства над дзіцячым домам. Работнікі крамы ставіліся да гэтай місіі адказна, не толькі збіралі грошы на падарункі дзецям пад Новы год, але і наведвалі іх. І вось аднойчы перад Вялікаднем наведаць дзяцей адважылася і сама Вольга. Паехала ў дзіцячы дом са сваёй калегай, якая часам брала некаторых дзяцей да сябе на выхадныя.

— Нікога я не збіралася браць, — успамінае Вольга Мікалаеўна. — У мяне яшчэ не было сваіх дзяцей, але я тады не сумнявалася, што яны з'явяцца, бо ў той час ужо спрабавала разам з урачамі разабрацца, у чым праблема нашай бяздзетнасці. Прыехалі на месца, а там нас сустрэла дырэктар і прапанавала мне ўзяць дзіця на выхадныя. Падумала, што гэта ж не назаўсёды, вазьму кагосьці з малых за кампанію з сяброўкай. Тады шасцігадовай Але прапанавалі паехаць са мной, і яна пагадзілася. Я яшчэ не ведала, што маё жыццё так цесна пераплядецца з гэтай кволенькай дзяўчынкай.

**«Гэтага ўсяго магло б і не быць, калі б я тады прыняла іншае рашэнне».**

Вольга нават не паведаміла пра сваё рашэнне мужу. Проста прывяла дзяўчынку дадому і сказала, што тая прыехала ў госці. Муж Сцяпан, чалавек па натуры вельмі добры, быў зусім не супраць.

— Гэта было так даўно... Памятаю, мы пайшлі ў парк і купілі ёй паветраны шарык, які хутка лопнуў, і ад таго яна вельмі расстроілася, плакала наўзрыд!

Выхадныя скончыліся, і Вольга Мікалаеўна адвезла дзяўчынку назад. На гэтым можна было паставіць кропку, але маленькая Ала так не лічыла. Наступнымі выхаднымі яна сабрала рэчы, каб зноў паехаць да Вольгі Мікалаеўны. Пайшла да дырэктара дзіцячага дома і спытала, калі па яе прыедуць. Тая трошкі разгубілася, але ўсё ж адказала малой, што Вольга Мікалаеўна — чалавек сур'ёзны і вельмі заняты, таму забраць не зможа, бо з'ехала ў камандзіроўку. Ала панура вярнулася ў групу. Сама ж дырэктар спешна патэлефанавала Вользе Мікалаеўне і спытала, маўляў, ці мае тая сур'ёзныя намеры ў адносінах да дзяўчынкі, бо трэба нешта прыдумаць, каб дзіця больш не чакала. Рашэнне было прынята імгненна. Вольга Мікалаеўна і сапраўды не змагла паехаць у той дзень у дзіцячы дом і папрасіла з'ездзіць туды свайго мужа і забраць малую.

— Памятаю, прыводзіць Сцёпа яе дадому, а я гляджу на Алу, і так маё сэрца сціснулася, так шкада стала гэтае дзяўчо..., — успамінае Вольга Мікалаеўна. — Падумала, ну і няхай жыве з намі, народзіцца малое, а ў мяне ўжо памочніца ёсць. Такі вось падарунак нам усім выйшаў на Вялікдзень.


Першакласніца Ала.

## Дадому

Сваё дзяцінства ў дзіцячым доме Ала амаль зусім не помніць.

— Я памятаю нейкія моманты, але яны заўсёды звязаныя з домам. Напрыклад, калі ўжо была ў сям'і, паехала да бабулі, якая жыла ад нас недалёка. Там я засталася нанач. Калі ўжо ляжала ў ложку, пачалася навальніца. І раптам — яскравы ўспамін, як я ляжу ў групе з іншымі дзецьмі, а за акном тая ж навальніца... Гэтыя ўспаміны я тады ніяк не аналізавала і не пыталася ў маці, адкуль яны. Я была ўпэўнена, што матуля забрала мяне дадому са звычайнага дзіцячага садка, і ўвогуле не разумела, што я прыёмная. Канешне, гэта прывяло да шоку ўжо пазней.

А для Вольгі Мікалаеўны самым вялікім здзіўленнем было ўбачыць медыцынскую картачку Алы. Якія там толькі не стаялі дыягназы: і ДЦП, і затрымка развіцця, і шмат чаго яшчэ... Ала за свае шэсць гадоў перанесла незвычайнае мноства захворванняў. Яна патрапіла ва ўстанову, калі ёй было ўсяго паўтара года. Прагнозы былі несуцяшальныя. Пайшла Ала толькі з трох гадоў і лічылася дзіцем, якое вельмі часта і цяжка хварэе.

— Медыцынская картачка мяне здзівіла, але я ўсё ж не бачыла ў гэтым сур'ёзнай праблемы, — расказвае Вольга Мікалаеўна. — Яе захворванні не былі прыкметныя. І я вырашыла проста выкінуць гэтую медыцынскую картачку.

Пасля таго як аформілі ўдачарэнне, жанчына прывяла дзіця ў паліклініку. Урачы агледзелі малую і не знайшлі сур'ёзных адхіленняў, акрамя праблем з вушамі.

— На жаль, хвароба ў дзяўчынкі была настолькі запушчана, што яна вельмі слаба чула. Мы хацелі зрабіць ёй аперацыю, каб выратаваць вушкі, павезлі яе да лепшага прафесара ў Мінску. Але ён сказаў, што пасля аперацыі ёсць рызыка застацца ўвогуле глухой. І мы не адважыліся.

У хуткім часе сям'і прапанавалі аддаць дзяўчынку ў інтэрнат для людзей, якія слаба чуюць. Але Вольга Мікалаеўна з мужам адмовіліся, вырашылі, што справяцца самі. І ў іх атрымалася.

## Выхаванне

Сама Вольга Мікалаеўна лічыць сябе строгай маці. У тыя часы не праводзілі курсы перад усынаўленнем, але жанчына выдатна разумела, чаму Ала хавае ежу ў ложку, і яе гэта не раздражняла. Яна спакойна тлумачыла зноў і зноў, што ў яе ніхто нічога не адбярэ. І з разуменнем ставілася да таго, што дзяўчынка ўвогуле не ведала, што такое абслугоўваць сябе.

— Алу прыцягвала ўсё, што было небяспечна ці нельга рабіць. Напрыклад, гульня з запалкамі... З-за гэтага муж вельмі хваляваўся за нашу бяспеку, ніякія размовы з малой не дапамагалі. У выніку ён проста ўзяў пачак запалак і даў ёй спаліць іх, але толькі пад яго наглядам. Ала была шчаслівая ад такой магчымасці. Але неўзабаве пасля пачатку «гульні» ёй на руку ўпаў падпалены кавалачак запалкі, і яна вельмі спалохалася. Мо тады і ўсвядоміла, што гэта не цацка.

Алу пачалі прывучаць да самастойнасці. Яна сама хадзіла ў школу, краму і ў паліклініку, сама рабіла ўрокі і знаходзіла сабе заняткі ў гуртках па інтарэсах. Вядома, не адразу ўсё атрымлівалася. Прыйшлося змяніць тры школы, перш чым Ала стала знаходзіць агульную мову з настаўнікамі і адчула сябе больш упэўнена на занятках. Вольга Мікалаеўна няспынна ўнушала дзяўчынцы, што яе жыццё — гэта яе адказнасць і што бацькі не заўсёды будуць побач. Цяпер яна часам думае, што нават перастаралася.

**«Я яшчэ не ведала, што маё жыццё так цесна пераплядецца з гэтай кволенькай дзяўчынкай».**

— Памятаю, прынясе Ала цацку якую ў дом, а мяне адразу ў жар кідае: «Хоць бы толькі не скрала». Цяпер ужо разумею, што часта проста занадта «ўглядалася» ў дзіця. Ала вырасла і стала цудоўнай і разумнай жанчынай. Яна, калі пасля школы паступала першы раз, праваліла экзамены. Але не стала чакаць год, а пайшла працаваць у сталовую пасудамыйкай, каб не сядзець у нас на шыі. Потым усё ж паступіла ў інстытут і атрымала вышэйшую адукацыю... Мне здаецца, што яна сама па сабе такая самастойная, і ў гэтым няма ніякай маёй заслугі.

Праўда, сама Ала так не лічыць. Яна ўпэўнена, што менавіта маці ўклала ў яе гэту якасць.

## Стаўленне навакольных

— Пра нас часта казалі непрыемныя рэчы за вочы. Асабліва калі стала зразумела, што ў мяне не будзе сваіх дзяцей. Урачы так і не змаглі мне растлумачыць, чаму ў нас не атрымалася... Для сябе я зразумела, што не ўсё залежыць ад дактароў. Рэакцыя сваякоў на наша рашэнне не прыняць Алу мяне спачатку абражала. Але ў хуткасці перастала хвалявацца.

Вольгу Мікалаеўну падтрымлівалі яе блізкія сябры, і ёй гэтага было дастаткова. Тыя, каго запрашалі ў дом, звычайна ставіліся да Алы з цеплынёй. У дзяўчынкі былі найлепшыя цацкі і самае моднае адзенне, якая магла быць у тыя часы... Але калі аднойчы разам з Алай да бабулі прыехалі іншыя сваякі і іх дзеці не сталі з ёй гуляць, бо яна «не родная», Ала шчыра здзівілася.

— Памятаю, як я разглядала свае рукі, ногі, твар у люстэрку і не магла зразумець, чым жа я адрозніваюся ад іншых дзяцей і чаму яны не хочуць са мной сябраваць, — успамінае Ала. — Я не разумела, што такое дзіцячы дом і чаму мая маці быццам бы не мая.

У выніку дзяўчынка прыняла рашэнне спытаць пра гэта ў мамы і атрымала праўдзівы адказ...

Ала памятае звон у вушах ад навіны. У яе галаве нібыта склаўся нейкі пазл. Прыйсці ў сябе дапамагла маці, якая сказала, што яна іх дачка назаўсёды. Гэта ёй тады дапамагло.

Дзяўчына яшчэ не раз потым у сваім жыцці чула непрыемнае ў свой адрас. Яе спынялі мінакі ў роднай весцы таты і ўпэўніваліся, ці ведае яна аб сваім паходжанні. Ала старалася спакойна адказваць такім людзям, хоць і сёння не разумее матываў тых «добразычлівіцаў». Нават першае каханне падлетка было сапсавана гісторыяй аб сіроцтве. Маці каханага Алы вельмі перажывала, што падумаюць людзі... Жанчына да гэтага часу з горыччу згадвае тыя моманты.

**«Яе спынялі мінакі ў роднай весцы таты і ўпэўніваліся, ці ведае яна аб сваім паходжанні.»**

На жаль, да сірот у нашай краіне ставяцца, па словах выдатнага расійскага псіхолага Людмілы Петраноўскай, як да «няшчасных сіротак» ці «злачынцаў па вызначэнні». **Дырэктар цэнтра псіхалагічнай падтрымкі ўсынавіцеляў «Родныя людзі», псіхолаг Вольга ГАЛАЎНЁВА** лічыць, што беларусам яшчэ доўга прыйдзецца працаваць над прыняццем і разуменнем тых, хто чымсці адрозніваецца ад астатніх, хоць ужо зроблены нейкія крокі ў гэты бок. Сама ж Ала нават сёння стараецца нікому не гаварыць аб сваім паходжанні. Яна не саромеецца, але не хоча сутыкацца з прадузятым стаўленнем да сябе і сваёй сям'і. Тым часам Вольга Мікалаеўна лічыць сябе шчаслівым чалавекам.

— Я ніколі не шкадавала, што ўзяла Алу, — гаворыць яна. — Мая дачка прынесла мне шмат радасці і перажыванняў, звычайных для любой жанчыны... Я бачу, якая мая Ала цудоўная маці, як ёй удаецца ўсё паспяваць і захоўваць сваю сям'ю моцнай. Гэтага ўсяго магло б і не быць, калі б я тады прыняла іншае рашэнне.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

**Больш інфармацыі глядзіце на сайце «Звязды».**



Інфаграфіка Аляксандра АСІПЕНКІ.

**Падрабязней пра ўсынаўленне і дапамогу для ўсынавіцеляў можна даведацца на сайтах: http://nacedu.by/ і https://rodnye.by/**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# АДЗІНОКАЯ МАЦІ — ГЭТА НЕ ПРЫСУД


psychologies.ru

**Сітуацыя, калі жанчына мае дзяцей, але не замужам, яшчэ і сёння ўспрымаецца ў грамадстве неадназначна. Адны лічаць такі расклад нормай, а іншыя спрабуюць вярнуць гераіню ў рамкі «прыстойнасці». Мы звярнуліся да псіхолага, каб зразумець, дзе такая з'ява перастае быць выключэннем, бо становіцца проста камфортным выбарам для асобнага чалавека.**

## Стэрэатып — вораг у бліжнім

Згадваецца гісторыя, калі маёй знаёмай, якая шукала кватэру, адна з гаспадынь напісала: «Жанчына з дзіцем — не паказчык прыстойнасці». У дзяўчыны гэта выклікала спачатку абурэнне і слёзы, а потым мы сышліся на тым, што няўменне нейкага чалавека бачыць далей за сваё акно — не прычына адчайвацца... Людзей з «багатым жыццёвым вопытам» і жаданнем дзяліцца ім з тымі, хто побач, вакол нас хапае. Праўда, калі па шчырасці, то з узростам пачынаеш такіх добразычліўцаў трымаць на адлегласці.

— У грамадстве звычайна меркаванне такое, што жанчына павінна выхоўваць дзіця з мужам. А калі гэта адзінокая маці, то адразу ў некаторых узнікаюць думкі, быццам нешта з ёй можа быць не так. Усе такія высновы, як правіла, не маюць ніякага пацвярджэння на практыцы, але прысутнічаюць у мысленні людзей. Гэтыя ўстаноўкі, стэрэатыпныя перакананні цягнуцца з мінулага. І якраз адзінокія жанчыны вельмі часта сустракаюць на сваім шляху асуджэнне навакольных, — кажа **Вера ПРОХАРЧЫК, псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.** — Таму вельмі важна быць незалежнай ад чужых поглядаў, бо заўсёды знойдзецца калега, бабуля ці яшчэ нехта, хто захоча вас папракнуць і выказацца па вашай сітуацыі. Розніца толькі ў рэакцыі на такія заўвагі — адна паслухае і пойдзе далей, а іншая пачне думаць: «Мабыць, са мной нешта не так». Аднак адзінокай жанчына можа быць не толькі таму, што нарадзіла сама, але і ў выніку разводу альбо гібелі мужа. Якая ні была б прычына, жанчына пачынае вінаваціць сябе ў тым, што яе дзіця расце без бацькі. Разам з тым важна разумець, што пачуццё віны — разбуральнае і мае адмоўныя наступствы. Так, напрыклад, жанчына пачынае зашмат часу ўдзяляць дзіцяці, залішне непакоіцца пра яго або ні ў чым яму не адмаўляе. Як вынік, вялікая рызыка, што дзіця вырасце несамастойнае.

У такіх сітуацыях, раіць спецыяліст, вельмі важна засяродзіць увагу на пошуку апоры для сябе, а не паддавацца эмоцыям. Ды і ўвогуле, калі жанчына свядома вырашае нарадзіць для сябе, маючы прафесію, працу, то гэта яе выбар і рашэнне. У большасці еўрапейскіх краін такая сітуацыя даўно нармальная і звыклая. А вось у нашым грамадстве жанчыны могуць сустрэцца з непаразуменнем і асуджэннем. Бо ў нас лепш быць замужам (нават калі ты нешчаслівая ў гэтых адносінах), таму што так прынята. Але ж давайце разважаць, няўжо для дзіцяці лепш бачыць двух сваіх блізкіх людзей няшчаснымі? Ці не сапсуе гэта сцэнарый для яго будучай сям'і?.. Іншая сітуацыя, калі жанчына спрабуе як мага хутчэй пабудаваць новыя адносіны, зноў жа па прычыне «дзіцяці патрэбен бацька», а не таму што гатовая да новага ў сваім жыцці.

## Не плаціце за шчасце сабой

— Незалежна ад таго, чаму вы зараз адзінокая, вельмі важна ўзяць паўзу і засяродзіцца на сваім асабістым жыцці. Бо ёсць роля маці, а ёсць вы як жанчына, — працягвае псіхолаг. — Тут варта факусіравацца на сваіх інтарэсах, хобі, сустрэчах з сябрамі і тымі, хто праявіць разуменне і падтрымае, а не будзе яшчэ больш ціснуць на вас. Вядома, цяжка выхоўваць дзіця адной, стамляешся фізічна і маральна, таму трэба мець тое, што вас падтрымлівае і дае энергію. Калі вам патрэбныя адносіны і вы гатовыя да іх, то цудоўна. А ў адваротным выпадку шукайце тыя занятки, якія робяць вас шчаслівай і ўпэўненай. Зразумейце, у чым вашы інтарэсы, акрамя саміх дзяцей.

І, думаю, для нас, жанчын, гэта парада вельмі слушная, бо пазіцыя «я ўсё раблю дзеля дзяцей» аднойчы можа пакінуць за сабой толькі расчараванне. Сын ці дачка вырастуць, а наша адзінота, перш за ўсё ўнутраная, застанецца з намі. Бясспрэчна, наяўнасць мужчыны (з якога дзіця зможа браць прыклад) важная. Калі ж пакуль вы не гатовыя да новых адносін ці проста не хочаце кагосьці пускаць на сваю тэрыторыю, то такую важную ролю можа выканаць дзядуля, дзядзька, настаўнік у школе, трэнер спартыўнай секцыі ці нават хросны бацька. Галоўнае, не спрабуйце імгненна вырашыць пытанне любой цаной. Самае важнае тут — гэта ваша самаадчуванне. Бо дзеці счытваюць усе нашы эмоцыі. Нікому не патрэбна ахвярнасць, у выніку якой усе будуць незадаволеныя.

— Цудоўна, калі ў мамы складуцца новыя адносіны, але нават калі гэтага не будзе, то не трэба думаць, што дзіця вырасце нейкае непаўнавартаснае. Мне здаецца, што асноўная праблема нашых матуль — гэта іх эмацыянальны стан, — дзеліцца Вера Васільеўна. — Калі жанчына паддаецца негатыўнаму ўплыву акружэння, то яна пачынае жыць у пастаянным стрэсе, замест таго каб быць шчаслівай і радавацца свабодзе. Спыніцеся і спытайце ў сябе: як я жыву, якія адносіны мне патрэбны, чаму нешта не складваецца? І ў працэсе, нават калі ёсць праблемы з самаацэнкай, вы зможаце ўбачыць, куды рухацца, і лепш зразумееце сябе.

## Нашы людзі знойдуцца

Якія абставіны не змусілі б жанчыну застацца адной з дзецьмі, жыццё працягваецца. І кожная з нас мае права будаваць яго так, як лічыць патрэбным і правільным. Можа, вы тая, хто вырашыў «нарадзіць для сябе», таму што дзіця — гэта ваша мара, а вось жыць з кімсьці і раздзяляць побыт — зусім не ваш варыянт. Магчыма, вы сышлі ад мужа, таму што зразумелі, што паасобку будзе лепш, чым заставацца разам як чужыя. Галоўнае, каб вы знайшлі ў сабе сілы быць шчаслівай. Вашы погляды на жыццё могуць не супадаць з поглядамі тых, хто побач. А можа нават здарыцца, што такі расклад дасць падставу правесці «рэвізію» свайго кола сяброў і знаёмых. Давайце будзем чыстымі, часам агульныя сябры выбіраюць не вашу кампанію пасля разводу, а замужнія сяброўкі ўвогуле пачынаюць бачыць у вас канкурэнтку... Але нашы людзі застаюцца з намі, і нават мужчына знаходзіцца (калі мы гатовыя яго сустрэць). І прымаюць яны нас з усімі нашымі «абставінамі».

Жанчыне важна, каб побач быў той, з кім можна падзяліцца падзеямі пражытага дня. Разам з тым напрошваецца пытанне, а ці ўдасца новаму чалавеку пабудаваць адносіны з маімі дзецьмі, ці прыме яго сын або дачка? Тут важна даць кожнаму з бакоў час і права выбару. Безумоўна, новыя адносіны могуць складвацца па-рознаму, але сур'ёзна настроены мужчына, які любіць жанчыну, гатовы пераадольваць цяжкасці. Калі гэта ваш чалавек, то ўсё абавязкова складзецца і вы станеце сям'ёй. Галоўнае — размаўляйце і чуйце адно аднаго.

**Алена ДРАПКО.**

# ЗОРНЫЯ АДЗІНОКІЯ МАЦІ

**Сярод паспяховых і знакамітых жанчын таксама ёсць прыклады адзінокіх маці. Яны жывуць тымі ж праблемамі і клопатамі, што і любая з нас: як выхоўваць, як зарабляць, але разам з тым перакананыя, што дзеці — шчасце.**



## Шарліз ТЭРОН

Актрыса і прадзюсар Шарліз Тэрон не была замужам, аднак гэта не перашкодзіла ёй стаць маці. Жанчына ўсынавіла хлопчыка Джэксана і ўдачарыла дзяўчынку Аўгусту. У размове з журналістамі актрыса неяк прызналася, што адной выхоўваць дзяцей няпроста, але для яе гэта добры стымул: «Бываюць вельмі складаныя перыяды, напрыклад калі дзеці ў істэрыцы ці яшчэ нешта. І калі ты адна, то напружанне вельмі моцнае. Але з таго моманту, як у мяне з'явіліся дзеці, я ні разу пра гэта не пашкадавала». Часам яе крытыкуюць за нейкія моманты ў выхаванні, але зорная мама не звяртае ўвагі на меркаванне староннх і працягвае рабіць так, як лічыць правільным. Разважаючы пра мацярынства, Тэрон прызнаецца, што клопат пра дзяцей зрабіў яе вельмі прыземленай і «рэалістычнай».



## Сандра БУЛАК

У жыцці Сандры Булак склалася так, што першае прыёмнае дзіця з'явілася, калі яна разышлася з мужам, даведаўшыся пра яго здрады. Хлопчыка Луі яна ўсынавіла ў 2010-м, а праз пяць гадоў у іх сям'ю прыйшла дзяўчынка Ліла. Актрыса таксама не хавае, што жыццё адзінокай маці не з лёгкіх, але ўсведамленне, што ў яе ёсць сям'я, робіць яе надзвычай шчаслівай. «Сотні тысяч дзяцей гатовыя стаць вам роднымі. Ты назаўсёды становішся маці з той хвіліны, калі прымаеш дзіця і яго любоў», — лічыць актрыса.



## Юлія ВОЛКАВА

Вядомая многім як удзельніца гурта «t.A.T.u» Юлія Волкава сёння ўжо маці двух дзяцей. Спявачка адна выхоўвае сына Саміра і дачку Вікторыю. Аднаму глянцаваму выданню Юлія прызналася, што быць маці — гэта галоўнае ў жыцці жанчыны. Таксама артыстка сказала, што не абмяжоўвае сустрэчы дзяцей з іх бацькамі, але для яе відавочна, што мужчыны сёння не гатовыя да адказнасці.



## Рыта ДАКОТА

Маладая спявачка Рыта Дакота пасля разводу са спеваком Уладам Сакалоўскім самастойна выхоўвае дачку Мію. Артыстка, якая актыўна дзеліцца падзеямі ў сваім жыцці з падпісчыкамі ў сацыяльных сетках, неяк напісала, што добрымі бацькамі яна і Улад сталі менавіта пасля таго, як разышліся. Разам з тым Рыта кажа, што сумяшчаць мацярынства і працу — справа не самая лёгкая, даводзіцца шукаць кампрамісы.

# КАБ СПРАВІЦЦА З БЕДНАСЦЮ

## Трэба пашыраць сістэму сацыяльнай абароны

**Праз пандэмію COVID-19 у свеце рэзка ўзрасла колькасць дзяцей, якія жывуць у беднасці — апошняя вымяраецца не толькі грашовымі даходамі, але і магчымасцю вучыцца, лячыцца і мець дах над галавой. Пра гэта гаворыцца ў новым даследаванні, праведзеным пад эгідай Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ), паведамляе Цэнтр навін ААН.**

Даследаванне было падрыхтавана ЮНІСЕФ і арганізацыяй «Выратуем дзяцей». Яно паказала адно з сур'ёзных наступстваў пандэміі COVID-19 — рост колькасці дзяцей, якія жывуць ва ўмовах так званай шматаспектнай беднасці. Зараз такіх каля 1,2 млрд, а гэта на 150 млн больш, чым да пандэміі.

Пры аналізе шматаспектнай беднасці выкарыстаны даныя з 70 краін. Яны датычыліся доступу да адукацыі, аховы здароўя, жылля, харчавання, санітарыі і вады. У папярэднім аглядзе, праведзеным у гэтых краінах яшчэ да пандэміі, было ўстаноўлена: каля 45 % дзяцей пазбаўлена доступу па меншай меры да адной з гэтых выгод. Аднак новыя даныя паказваюць, што сітуацыя толькі пагоршылася і ў найбліжэйшыя месяцы стане яшчэ цяжэйшай.

— З-за COVID-19 і мер ізаляцыі, уведзеных, каб прадухіліць яго распаўсюджванне, мільёны дзяцей аказаліся ў беднасці, — заявіла **выканаўчы дырэктар ЮНІСЕФ Генрыета ФОР.** — Тыя сем'і, што ўжо спраўляліся з цяжкім становішчам, зноў у бядзе, а некаторыя сутыкнуліся з такімі праблемамі, якіх не ведалі раней. Найбольшую трывогу выклікае тое, што мы пакуль бліжэй да пачатку гэтага крызісу, чым да яго канца.

Эксперты адзначаюць: грашовыя даходы сем'яў, безумоўна, важныя, але яны даюць толькі частковае ўяўленне аб становішчы. Каб зразумець увесь маштаб беднасці, неабходна прааналізаваць усе праблемы, з якімі сутыкаюцца дзеці з уразлівых слаёў насельніцтва, — ад медыцыны і адукацыі да водазабеспячэння і жыллёвых умоў. У ААН лічаць, што толькі паляпшэнне паказчыкаў ва ўсіх гэтых кірунках дапаможа ліквідаваць шматаспектную беднасць.

Да таго ж справіцца з беднасцю сярод дзяцей не ўдасца без спецыяльных праграм сацыяльнай абароны, належнай падаткова-бюджэтнай палітыкі, павышэння занятасці бацькоў і прадастаўлення ім аплатных водпускаў па доглядзе за дзіцем.

Асаблівая ўвага ў новым даследаванні аддадзена праблеме няроўнага доступу дзяцей да новых тэхналогій. Сёння гэта перашкаджае атрыманню адукацыі.

— Дзеці, пазбаўленыя магчымасці вучыцца, з большай верагоднасцю стануць ахвярамі прымусовай працы або ранніх шлюбаў, — лічыць **генеральны дырэктар Міжнароднага альянсу «Выратуем дзяцей» Інгер ЭШЫНГ.** — Мы не можам дазволіць цэламу пакаленню дзяцей стаць ахвярамі гэтай пандэміі. Урады і міжнародная супольнасць павінны распачаць неабходныя дзеянні.

Кіраўнік ЮНІСЕФ заклікала ўрады аддаваць першачарговую ўвагу найбольш маргіналізаваным сем'ям, пашыраць сістэму іх сацыяльнай абароны, у тым ліку забяспечваць грашовыя выплаты, наладжваць дыстанцыйнае навучанне, гарантаваць дзецям медыцынскую дапамогу і забяспечваць іх школьным харчаваннем.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

## Антикризисный управляющий СООО «Копыльское производство строительных систем» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении следующих торгов:

**• 09.10.2020 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности СООО «Копыльское производство строительных систем»:** Гамисония Отари Гогиевич (размер задолженности – 23 324,45 BYN) – первоначальная цена – 20 992,01 BYN; ОАО «Стройтрест № 13» (размер задолженности – 11 204,28 BYN) – первоначальная цена – 10 083,85 BYN; ГУКДСП «Климовичская ПМК-256» (размер задолженности – 4 930,93 BYN) – первоначальная цена – 4 437,84 BYN; ООО «Вуд-Амаранд» (размер задолженности – 10 351,01 BYN) – первоначальная цена – 9 315,91 BYN; ОАО «Оршанский стройтрест № 18» (размер задолженности – 1 269,17 BYN) – первоначальная цена – 1 142,25 BYN; ООО «Фортенс» (размер задолженности – 66 425,01 BYN) – первоначальная цена – 59 782,51 BYN; ООО «Вирас и Ко» (размер задолженности – 943,15 BYN) – первоначальная цена – 848,84 BYN; ООО «ТермоГрад» (размер задолженности – 501,73 BYN) – первоначальная цена – 451,56 BYN; Унитарное предприятие «СУ № 25» (размер задолженности – 84 708,94 BYN) – первоначальная цена – 76 238,05 BYN; ООО «ОМКЦ 2001» (размер задолженности – 4 446,76 BYN) – первоначальная цена 4 002,08 BYN; ООО «ТаМиСТРОЙ» (размер задолженности – 17 084,02 BYN) – первоначальная цена – 15 375,62 BYN; ООО «ДеАДЕБС-строй» (размер задолженности – 38 948,90 BYN) – первоначальная цена – 35 054,01 BYN; ОДО «Юверс 2007» (размер задолженности – 23 070,26 BYN) – первоначальная цена – 20 763,23 BYN; ОДО «АнаитисПромТорг» (размер задолженности – 40 596,29 BYN) – первоначальная цена – 36 536,66 BYN; ООО «Вераллета» (размер задолженности – 20 781,46 BYN) – первоначальная цена – 18 703,31 BYN; Частное предприятие «Торгдомстрой» (размер задолженности – 1 630,56 BYN) – первоначальная цена – 1 467,50 BYN; ДУП «ПМК-218» УП «Минскоблсельстрой» (размер задолженности – 6 291,77 BYN) – первоначальная цена – 5 662,59 BYN; ООО «ОптСтройСклад» (размер задолженности – 40 503,12 BYN) – первоначальная цена – 36 452,81 BYN; ИП Зубов Василий Александрович (размер задолженности – 47 033,92 BYN) – первоначальная цена – 42 330,53 BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. **Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 08.10.2020 г.** Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 08.10.2020 г. вкл. на р/с СООО «Копыльское производство строительных систем», УНП 690653993, р/с BY54 BPSB 3012 1654 1301 1933 0000, BIC BPSBBY2X, в ОАО «БПС-Сбербанк».

**• 26.10.2020 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности СООО «Копыльское производство строительных систем»:** ООО «АнгелоДекор» (размер задолженности – 17 610,40 BYN) – первоначальная цена – 17 610,40 BYN; ИП Артемьев П. К. (размер задолженности – 2 913,82 BYN) – первоначальная цена – 2 913,82 BYN; ООО «ЗЕНИТплюс» (размер задолженности – 3 667,12 BYN) – первоначальная цена – 3 667,12 BYN; ООО «Оркапстрой» (размер задолженности – 11 371,26 BYN) – первоначальная цена – 11 371,26 BYN; ООО «Центр системных инноваций» (размер задолженности – 21 400,29 BYN) – первоначальная цена – 21 400,29 BYN; ООО «ФартФам» (размер задолженности – 4 812,53 BYN) – первоначальная цена – 4 812,53 BYN; Кимбару А. С. (размер задолженности – 7 608,30 BYN) – первоначальная цена – 7 608,30 BYN; ООО «Торговый дом «Керабел» (размер задолженности – 5 382,02 BYN) – первоначальная цена – 5 382,02 BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота.

**Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 23.10.2020 г.** Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 23.10.2020 г. вкл. на р/с СООО «Копыльское производство строительных систем» УНП 690653993, р/с BY54 BPSB 3012 1654 1301 1933 0000, BIC BPSBBY2X, в ОАО «БПС-Сбербанк».

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 5 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляются участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

## ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона) извещает о проведении 27 октября 2020 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Гостиловичи, ул. Рябиновая, 9, кадастровый номер 623284601601000335,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,1069 | газификация | 8 500,00 | 850,00 | 1920,83 + расходы за размещение объявления |
| 2 | **д. Понизовье, ул. Руднянская, 5, кадастровый номер 623284604601000150,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,1400 | электрификация | 3 500,00 | 350,00 | 1381,38 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 27 октября 2020 в 10.00 по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, Логойский сельский исполнительный комитет, контактные тел.: 8 (01774) 28473, 8 (029) 1779511.

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 21.10.2020 включительно.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов.
2. Представить квитанцию об оплате суммы задатка.
3. Представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность.
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет BY25AKBB36006191011030000000, БИК AKBB BY 2X г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код 04901, получатель – Логойский сельский исполнительный комитет.

**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Капитальное строение с инвентарным номером 733/С-2779, расположенное по адресу: Могилевская область, г. п. Краснополье, ул. Ленинская, 2, общей площадью 29,6 кв. м, год постройки – 1976** |
| **Начальная цена продажи** | 4000,00 (четыре тысячи белорусских рублей, 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 666,67 (шестьсот шестьдесят шесть белорусских рублей 67 копеек) |
| **Сумма задатка** | 200,00 (двести белорусских рублей 00 копеек) – 5 % |
| **Открытый аукцион состоится** | **03.11.2020 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 02.11.2020 включительно по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, д. 3, второй этаж, кабинет 209 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | **По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по тел. (8-0222) 403122, моб. 8029-169-39-68** |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 200,00 белорусского рубля на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

*Аб'яднанне магчымасцяў усіх краін, інавацыйных і даследчыцкіх навукоўцаў з усіх адпаведных галін ва ўнікальным духу супрацоўніцтва дазволіць максімальна ўзмацніць узаемадапаўняльнасць усіх запушчаных ініцыятыў і паскорыць распрацоўку такіх неабходных свету лекаў і вакцын ад каранавіруса.*

*Таму Узбекістан выступае ў падтрымку міжнароднага супрацоўніцтва і рэалізацыі ініцыятыў па шырокім доступе да вынікаў распрацовак неабходных лекаў і вакцын супраць каранавіруса».*

У ліку экалагічных ініцыятыў, прапанаваных Прэзідэнтам Узбекістана да разгляду на прэстыжным сусветным форуме, — і шэраг іншых актуалій, звязаных перш за ўсё з жыццядзейнасцю ў цэнтральнаазіяцкім рэгіёне. Рэспубліка Узбекістан паслядоўна выбудоўвае мадэль суверэннай дзяржавы, якая імкнецца да паспяховага вырашэння многіх праблем.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кітай перамагае ў гандлёвай вайне з ЗША



З такім меркаваннем выступіў эксперт Bloomberg Эндру Браўн. Ён упэўнены, што Кітай умудрыўся перахітрыць Трампа практычна на кожным кроку на працягу ўсёй сусветнай гандлёвай вайны, якая распачалася неўзабаве пасля таго, як палітык заступіў на пасаду. Так, прафіцыт гандлёвага балансу Кітая з ЗША ўзрос амаль на 25 працэнтаў з пачатку прэзідэнцтва Трампа, перавысіўшы 300 мільярдаў долараў. Нельга не звярнуць увагу на ВУП Кітая, які павялічыўся на 3,2 % у другім квартале ў параўнанні з аналагічным перыядам 2019-га. А амерыканская эканоміка скарацілася на 32,9 % у гадавым выражэнні. Апроч іншага, юань умацоўваецца ўжо восем тыдняў запар, што з'яўляецца самым працяглым перыядам росту валюты з лютага 2018 года. Долар між тым пачаў слабець. «Гэта толькі пытанне часу, калі кітайскія фірмы стануць № 1 у свеце», — перакананы дырэктар-кіраўнік па знешнім гандлі Нямецкай асацыяцыі машынабудавання VDMA Ульрых Акерман.

### Time апублікаваў рэйтынг ста самых уплывовых людзей



Гэта сусветны рэйтынг па версіі выдання за 2020 год. Уплывовыя персоны падзялілі па катэгорыях — «Тытаны», «Наватары», «Дзеячы мастацтва», «Лідары» і «Куміры». Удзельнікаў спісу не ранжыравалі. Сярод «Лідараў» сёлета — дырэктар Нацыянальнага інстытута алергічных і інфекцыйных захворванняў ЗША Энтані Фаўчы, гендырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрас Аданом Гебрэесус, прэзідэнт ЗША Дональд Трамп і яго апанент на маючых адбыцца выбарах Джо Байдэн, старшыня КНР Сі Цзіньпін, канцлер Германіі Ангела Меркель, прэзідэнт Бразіліі Жаір Балсанару, прэм'ер Індыі Нарэндра Модзі, прэзідэнт Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен. «Тытанамі» Time называе гендырэктара Google Сундара Пічаі, вядучага эпідэміёлага Кітая Чжун Наньшаня, кіраўніка Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША Джэрома Паўэла, шасціразовага чэмпіёна «Формулы-1» Льюіса Хэмілтана, кіраўніка МВФ Крысталіну Георгіеву.

### Цырымонія ўручэння Нобелеўскіх прэмій пройдзе анлайн

Традыцыйная цырымонія ўручэння Нобелеўскіх прэмій сёлета зменіць фармат праз пандэмію COVID-19. Так, урачыстае ўзнагароджанне лаўрэатаў у Стакгольмскай канцэртнай зале адменена, паведаміў Нобелеўскі фонд. Яго заменіць анлайн-цырымонія з уключэннямі з некалькіх краін. Медалі і дыпломы будуць уручаны лаўрэатам, чые імёны стануць вядомыя з 5 да 12 кастрычніка ў іх родных краінах. Да гэтага могуць прыцягнуць пасольствы або ўніверсітэты, гаворыцца ў паведамленні фонду. Уручэнне ўзнагарод па традыцыі праходзіла ў Стакгольме і Осла ў дзень смерці Альфрэда Нобеля 10 снежня. А ў нарвежскай сталіцы, дзе ўручаюць прэмію ў галіне ўмацавання міру, урачыстасць пройдзе ў менш маштабным фармаце — не ў ратушы, а ва ўніверсітэце Осла, дзе яна не праводзілася з 1990 года.

## ИЗВЕЩЕНИЕ (ИНФОРМАЦИЯ) О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 23 октября 2020 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 290-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – УП «Жилье»,** тел. +375 (177) 76 85 32 | | | | | | | |
| 61 | Минская обл., г. Борисов, пр-т Революции, 33 | 44,0 | 1,0 | 185,90 | Под офис, склад, организацию торговли непродовольственной группой товаров, оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр, а также физкультурно-оздоровительной деятельности) | 18,50 | Смежные помещения в подвале многоквартирного жилого дома. Имеются естественное освещение, отопление. Санузел общий. Электроснабжение отсутствует, есть возможность его подключения. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| 62 | Минская обл., г. Борисов, ул. Демина, 2 | 370,2 | 1,0 | 1 564,10 | Под производство (за исключением лесопильного производства), склад | 156,40 | Помещения в одноэтажном здании лесокомплекса с естественным освещением. Отсутствуют отопление, водоснабжение и канализация. Имеется возможность подключения электроэнергии. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| 63 | Минская обл., г. Борисов, ул. Максима Горького, 94-89 | 143,2 | 3,0 | 605,02 | Под офис, организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров, оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности), с возможностью использования части помещения под склад | 60,50 | Помещение на 1-м этаже жилого дома. Стены панельные, вентиляция естественная, центральное отопление, освещение – электропроводка скрытая, полы – бетонные, плитка. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| 64 | Минская обл., г. Борисов, ул. Орджоникидзе, 57 | 24,12 | 1,0 | 101,91 | Под офис, организацию торговли непродовольственной группой товаров, оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр) | 10,10 | Помещение в подвале девятиэтажного жилого дома. Стены панельные, вентиляция естественная, центральное отопление, есть возможность подключения к электроснабжению, полы – бетонные. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| 65 | Минская обл., г. Борисов, ул. Серебренникова, 24 | 22,8 | 3,0 | 96,33 | Под организацию торговли непродовольственной группой товаров, оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр, а также кроме физкультурно-оздоровительной деятельности), склад, офис | 9,60 | Два помещения на 1-м этаже многоквартирного жилого дома. Имеются естественное освещение, отопление, санузел. Электроснабжение отсутствует, есть возможность его подключения. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| 66 | Минская обл., г. Борисов, ул. Трусова, 22А | 17,1 | 3,0 | 72,25 | Под оказание услуг | 7,20 | Помещение на 2-м этаже административного здания. Имеются естественное освещение, отопление, санузел. Электроснабжение отсутствует, есть возможность его подключения. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| 67 | Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 29 | 112,61 | 3,0 | 475,78 | Под офис, организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров, оказание услуг (кроме ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности) с возможностью, при необходимости, использования части помещения под склад | 47,50 | Смежные помещения на 1-м этаже многоквартирного жилого дома. Имеются естественное освещение, отопление, санузел. Электроснабжение отсутствует, есть возможность его подключения. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| 68 | Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 34 | 34,07 | 3,0 | 143,95 | Под офис, организацию торговли непродовольственной группой товаров, оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности) с возможностью, при необходимости, использования части помещения под склад | 14,30 | Помещение на 1-м этаже жилого дома. Стены кирпичные, вентиляция естественная, центральное отопление, освещение – электропроводка скрытая, полы – бетонные. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| 69 | Минская обл., г. Борисов, ул. Демина, 2 | 139,2 | 1,0 – под производство продукции (за исключением распиловки, строгания и пропитки древесины и ее реализации субъектам малого и среднего предпринимательства); 1,0 – под склад площадью не менее 100 кв. м; 3,0 – под иные цели | 588,12 | Под офис, склад, организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров, оказание услуг, производство | 58,80 | Помещения в одноэтажном здании блока вспомогательных служб. Имеется естественное освещение. Отсутствуют отопление, водоснабжение и канализация. Имеется возможность подключения электроэнергии. **Срок аренды – 3 года** (22*) |
| | *22* Помещение обременений не имеет. Необходимые условия: заключение договоров на вывоз твердо-бытовых отходов, на снабжение электрической энергией; на пользование тепловой энергией в горячей воде; на отпуск воды и прием сточных вод* | | | | | | |
| **Арендодатель – учреждение «Национальный художественный музей Республики Беларусь»**, тел.: +375 (17) 328 68 44 – приемная; +375 (17) 327 79 12 | | | | | | | |
| 70 | г. Минск, ул. К. Маркса, 24 | 349,0, в т. ч. 110,76 – подвал; 191,74 – 1-й этаж; 46,5 – кафе-бар на 1-м этаже | 2,0 – 3 года; 3,0 – последующий период | 1 474,53 | Под объект общественного питания | 147,40 | Помещения в подвале и на 1-м этаже здания, которое является материальной историко-культурной ценностью категории «3». Здание не функционирует, находится в стадии реставрации в составе объекта «Реставрация и приспособление единого комплекса зданий Национального художественного музея Республики Беларусь». После ввода кафе в эксплуатацию и получения технического паспорта на кафе площадь будет уточнена в установленном порядке. **Срок аренды – 10 лет с момента ввода кафе в эксплуатацию и получения технического паспорта на кафе** (23*) |
| | *23* Работы по финишной отделке (помещения №№ 110–115, 117, 119–121), закупка необходимого технологического оборудования, мебели, сантехнической «посуды», кухонного оборудования и установка охранной сигнализации осуществляются на основании разработанной арендатором проектно-сметной документации за счет собственных средств арендатора без последующей компенсации затрат. Арендатор возмещает затраты арендодателю по корректировке проектно-сметной документации по помещениям кафе (финишная отделка (помещения №№ 110–115, 117, 119–121), технологическое оборудование, сантехническая «посуда», мебель, кухонное оборудование, охранная сигнализация). Срок завершения строительно-монтажных работ и ввод в эксплуатацию кафе – в течение 2 месяцев с момента ввода в эксплуатацию и получения технического паспорта здания по ул. К. Маркса, 24.* | | | | *Необходимо также соблюсти следующие условия: 1. Разработать дизайн-проект кафе и согласовать его с администрацией музея. 2. Требуемое название – ArtMuseumCafe. 3. Современная национальная кухня (новое разработанное меню). 4. Форма одежды – дизайн рабочей формы сотрудников кафе согласовывается с администрацией музея с обязательным размещением музейного логотипа и в корпоративном цвете. 5. Требование к персоналу – владение 3 языками: белорусским, русским, английским. 6. Режим работы арт-кафе – с 11.00 до 24.00* | | |
| **Арендодатель – Белорусский государственный университет**, тел. +375 (17) 209 55 22 | | | | | | | |
| 71 | г. Минск, ул. Кальварийская, 9 | 34,3 | 3,0 | 144,92 | Под организацию учебного процесса по повышению квалификации руководящих работников и специалистов в области обеспечения информационной безопасности | 14,40 | Помещение № 517 на 5-м этаже. Вход общий. Помещение не требует ремонта. Имеются естественное и искусственное освещение, отопление, вентиляция в рабочем состоянии, горячее и холодное водоснабжение (24*) |
| | *24* Необходимые условия: помещение передается вместе с материальными ценностями по отдельному договору (согласно перечню), оформление арендатором договора на электроснабжение (с выполнением всех необходимых требований РУП «Минскэнерго» филиалов «Энергосбыт» и «Энергонадзор»), установка электросчетчика. Все расходы за средства арендатора без последующей компенсации затрат* | | | | | | |

**Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.**

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. + 375 (17) 360 42 22.

**Аукцион состоится 23 октября 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).**

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 23 сентября 2020 г. по 19 октября 2020 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе:**

к участию в аукционе допускаются юридические или физическое лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий расчетный счет сумму задатка по соответствующему предмету аукциона, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и получившие билеты участников аукциона с указанием порядковых номеров, под которым данные лица зарегистрированы.

При этом лицо, желающее принять участие в аукционе:

*- уплачивает задаток по соответствующему предмету аукциона на текущий (расчетный) банковский счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 190398583, получатель платежа – государственное предприятие «МГЦН», назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 290 от 23.10.2020 по предмету аукциона № __;*

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе (бланк заявления можно получить у организатора аукциона) с приложением следующих документов:

*юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:*

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона;

*юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:*

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона;

*индивидуальный предприниматель:*

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона;

*физическое лицо* – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение, бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность, а представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Порядок определения победителя аукциона:**

аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион по каждому предмету аукциона начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Дополнительная информация:**

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

юридические лица и индивидуальные предприниматели производят оплату задатка исключительно платежным поручением;

при отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Положением, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона, засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона);

договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом), заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается;

базовая арендная величина (БАВ) с 01.04.2019 до 30.09.2020 составляет 16,90 рубля.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов: + 375 (17) 360 42 22, бухгалтерия: + 375 (17) 366 36 58, отдел аренды: + 375 (17) 373 47 29.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы на право аренды помещений»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by;** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

Люстэрка лёсу

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

# З кнігі «МОЙ ФІЗМАТ»

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 22 і 23 верасня.)*

## Іван Іванавіч МАРТЫНАЎ

Мы былі яшчэ першакурснікамі, калі ў фае першага паверха ўбачылі незвычайную для нас, яркую аб'яву. Фізмат віншаваў свайго выпускніка Івана Іванавіча Мартынава з паспяховай абаронай кандыдацкай дысертацыі. Гэта навіна на мяне, напрыклад, падзейнічала пазітыўна, можна нават сказаць, натхніла. Да гэтага часу мы ўжо адчулі, што вучыцца на фізмаце вельмі цяжка, за непаспяховасць адлічваюць рэгулярна і не шкадуючы, задача-мінімум — выжыць, утрымацца ў інстытуце. А тут — выпускнік нашага факультэта паступіў у аспірантуру і адразу пасля яе заканчэння абараніўся, стаў кандыдатам фізіка-матэматычных навук у галіне тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў. Ён жа змог! Значыць, не трэба баяцца і здавацца — можна, пастараўшыся, і пэўных вышынь дасягнуць.

Іван Іванавіч быў родам з невялікай вёскі Петухоўка Чавускага раёна. Нарадзіўся ў час вайны і зусім дзіцем патрапіў у канцлагер, выжыў, пасля добра вучыўся, паступіў на наш фізмат, і там яго прыкмецілі выкладчыкі. Парэкамендавалі ў аспірантуру да прафесара БДУ Ю. С. Багданава. Юрый Станіслававіч — вучань акадэміка М. П. Яругіна, заснавальніка і натхняльніка навуковай школы сусветнага ўзроўню, таксама адзін з самых аўтарытэтных матэматыкаў Беларусі. Ён лічыў Івана Іванавіча адным з найлепшых сваіх вучняў, пры гэтым шанаваў у ім перш-наперш чалавечыя якасці: чэснасць, адказнасць, прыстойнасць. Выхаваны цяжкай вясковай працай, пабачыўшы на сваё вочы зло, гвалт, вераломства і здрадніцтва, Мартынаў вызначаўся абвостраным пачуццём справядлівасці. Да студэнтаў, калег, увогуле да людзей адносіўся паважліва, нават клапатліва, але да тае пары, пакуль не сутыкаўся з непрыстойнасцю і зламыснасцю. Вось тады яго адносіны да такога чалавека станавіліся прынцыпова патрабавальныя, а часам і непрымірымыя.

Пакуль мы вучыліся на малодшых курсах, Іван Іванавіч быў у нас намеснікам дэкана. Ён шчыра любіў свой фізмат, імкнуўся, каб наш факультэт быў найлепшы ў інстытуце, вельмі шмат часу праводзіў са студэнтамі. Дапамагаў рыхтаваць камсамольскія і прафсаюзныя сходы, удзельнічаў з намі ў суботніках, прысутнічаў на ўсіх рэпетыцыях пры падрыхтоўцы да конкурсаў мастацкай самадзейнасці. Запомнілася, што пасля нашых выступленняў на сцэне ён купляў для нас велізарны куль цукерак.

Пры ўсёй знешняй строгасці Іван Іванавіч валодаў унікальным пачуццём гумару і быў арганізатарам многіх розыгрышаў сваіх сяброў. У той час калі ён абараніў дысертацыю, у інстытут для працы на фізмаце былі накіраваныя яго равеснікі, таксама маладыя кандыдаты фізіка-матэматычных навук: К. К. Жылік, Я. В. Карабёнак, А. К. Лапкоўскі. Усе былі яшчэ халастыя, жылі ў студэнцкім інтэрнаце, сябравалі. Іван Іванавіч пасля расказваў, што яны там выраблялі.

У гэты ж час на геаграфічны факультэт прыехала выкладаць маладая, стройная, нязвыкла для нас прыгожая асецінка. Яна, безумоўна, не магла не прыцягнуць да сябе ўвагу гэтых халасцякоў. А. К. Лапкоўскі прыўдарыў за ёю з усім запалам, але... узаемнасці не дамогся. Мартынаў і кампанія назіралі з боку за гэтымі заляцаннямі і вырашылі Анатоля Кузьміча разыграць. Іван Іванавіч апрануўся так, як тая асецінка, прылёг на ложак, накрыўся з галавой, а яго сябры сказалі Лапкоўскаму, што дзяўчына вельмі засмучаная, не зразумела яго адносіны да сябе, перажывае, плача. Анатоль Кузьміч імгненна кінуўся яе супакойваць, гладзіў, гаварыў ласкавыя словы, прызнаваўся ў сваіх пачуццях. І раптам з галавы «дзяўчыны» спадае хустка і адкрываецца гарэзны твар Мартынава... Лапкоўскі доўга не мог дараваць Івану Іванавічу гэтую дурноту, але з часам яна ўвайшла ў бяскрыўдны фальклор інстытута.

Мартынаў быў нейкім зямным, рэальным, блізкім да нас, студэнтаў, чалавекам. Строгім, але зразумелым, у нечым і арыгінальным. <...>

Лекцыі да нас Мартынаў прыйшоў чытаць на трэцім курсе. Гэта была тэорыя функцый сапраўдных пераменных. Матэматыку ён, безумоўна, адчуваў і ведаў. Але канспект за ім пісаць было няпроста — вельмі імпульсіўны, імклівы, часам у яго думкі апярэджвалі словы. Таму да экзамену мы рыхтаваліся па падручніках. Характэрна, што як вучоны-матэматык ён патрабаваў паказаць веды, разуменне выкладзенай тэорыі, а не адказу выключна па яго канспекце. Іван Іванавіч бачыў здольнасці студэнтаў, іх адносіны да вучобы, адкрыта паважаў і падтрымліваў тых, хто праяўляў стараннне. У нас на экзамене быў пацешны выпадак. Мой аднакурснік Валерый Іваноў забыўся доказ незлічонасці мноства сапраўдных лікаў і стаў пацыху прасіць мяне дапамагчы яму ў гэтым. Мартынаў і яго, і мяне ведаў як добрых студэнтаў, але ніяк не мог зразумець, хто каму падказвае. Так і не разабраўся, але ўсё ператвараў у жарт, як след пры адказе апытаўшы абодвух, і кожнаму з нас паставіў «выдатна».

З Іванам Іванавічам мы з часам пасябравалі. Пры гэтым неяк натуральна, як быццам так і павінна быць. Пры ім я пачынаў працаваць асістэнтам, шукаў сябе ў навуцы, абараняўся, паступова падымаўся па службовай лесвіцы. Зблізкала нас і тое, што яго жонка Зінаіда была маёй зямлячкай, яна родам з Быхава, і мы з ёю часта прыгадвалі родныя абодвум нам мясціны. Яна, дарэчы, таксама скончыла наш фізмат і нават некаторы час працавала на факультэце.

Я вельмі ўдзячны Івану Іванавічу за тое, што ён пазнаёміў мяне з гісторыкам Якавам Іванавічам Трашчанком. Ён тады быў суседам Мартынавых, і мы часам збіраліся разам у Івана Іванавіча пасядзець, пагаварыць, выпіць. Мартынаў і Трашчанок былі ў нечым падобныя — абодва разумныя, дзёрзкія, бескампрамісныя, начытаныя, са сваімі поглядамі на жыццё. Стасункі з імі — гэта сапраўдная школа развіцця, прафесіяналізму. Якаў Іванавіч да канца свайго жыцця заставаўся нашым настаўнікам. І не толькі нашым. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка быў адным з любімых вучняў Трашчанка. Мне — ужо як міністру адукацыі — даводзілася неаднаразова па даручэнні Прэзідэнта наведваць Якава Іванавіча, каб высветліць яго меркаванне па тым ці іншым гісторыка-палітычным пытанні. Для Прэзідэнта гэта было важна, ён таксама лічыў Якава Іванавіча сваім настаўнікам і даваў яму.

З часам Іван іванавіч заняў пасаду прарэктара па рабоце са студэнтамі-завочнікамі, захапіўся даследаваннямі ў галіне педагогікі. Яго чамусьці заўсёды цікавілі метады выхавання хлапчукоў. Рабіў усё Мартынаў энергічна, шырока, можна сказаць, азартна. Лідар па натуры, ён часам мог пераўзысці суразмоўцу, калегу, але пры гэтым захапіцца, адхіліцца ад тэмы, а то і зусім не патрапіць у яе. Ужо ў час свайго рэктарства гляджу вечарам праграму абласнога тэлебачання. Абмяркоўваюцца псіхалагічныя праблемы сямейных адносін. Два ўдзельнікі — загадчык кафедры псіхалогіі дацэнт Э. Катлярова і прарэктар універсітэта, дацэнт І. Мартынаў. Мартынаў, па характары непаседа, палеміст, часта перабівае Катлярову, хоць і відавочна саступае ёй у разуменні абмяркоўваемага пытання. Тая ледзьве паспявае выводзіць тэму ў патрэбнае рэчышча.

Клічу назаўтра раніцай да сябе Івана Іванавіча і кажу яму, што ён — прарэктар, прадстаўляе кіраўніцтва ўніверсітэта, таму не павінен саступаць загадчыцы кафедры. Адпаведна, ці трэба грунтоўна рыхтавацца, тым больш па пытанні, дзе ты не прафесіянал, ці сысці з праграмы. Іван Іванавіч сышоў з праграмы, але падобныя размовы ніяк не ўплывалі на нашы службовыя і сяброўскія адносіны. Мартынаў на мае пралікі і недапрацоўкі ўказваў карэктна, але без сарамлівасці.

Ёсць яшчэ гісторыя, якая, я ўпэўнены, не закончылася да гэтага часу. І яна таксама звязана з характарам Мартынава, яго ўпартасцю пры дасягненні мэты, якую ён перад сабой паставіў.

Сустракаю ва ўніверсітэце міністра адукацыі В. І. Стражава. Ён прыбыў з дзелавым візітам, але выходзіць з машыны ўзбуджаны, абураны, адразу заяўляе:

— Радзькоў, еду да цябе ва ўніверсітэт, а па дарозе ўключаю радыё і чую, як твой прарэктар Мартынаў накінуўся на мяне з крытыкай, што я не даю ход яго манаграфіі і тым самым перашкаджаю ўкараненню правераных, актуальных, на дзіва неабходных грамадству метадаў выхавання юнакоў. Ты разбярыся, што ў цябе за прарэктар!

Гісторыя для мяне не новая. Іван Іванавіч сапраўды напісаў кнігу пра тое, як трэба выхоўваць хлопчыкаў. Пісаў кнігу грунтоўна, карыстаўся архівамі, сучаснымі даследаваннямі ў галіне педагогікі і псіхалогіі, "даставаў" кожнага з нас, спрабуючы ўцягнуць у гэту праблематыку. Але, самае галоўнае, папку з рукапісам сваёй кнігі на дадзеную тэму ён дэманстратыўна, пры людзях, часцей за ўсё на вялікіх сходах уручаў новаму назначэнцу на пасаду міністра адукацыі. Яе атрымалі Л. У. Сухнат, М. І. Дзямчук, В. А. Гайсёнак, прыйшоў час і В. І. Стражава. Вось той і ўскіпеў. У мяне не заставалася выхаду, як самому прачытаць рукапіс, разабрацца з гэтай працай Мартынава. Прашу прынесці мне яго папку. Прачытаў на адным дыханні. Жыва, пераканаўча, проста, цікава. Кажу Івану Іванавічу:

— Методыку выхавання хлопчыка ў сям'і і ў грамадстве вы выбудоўваеце ў асноўным на прыкладзе жыцця Івана Грознага. Але ж гэта выхаванне перш за ўсё цара. Наўрад ці гэта падыходзіць для любога хлопца.

Не думаю, што я пераканаў Мартынава. Болей таго, упэўнены, што ён працягвае атакаваць сваімі ідэямі чарговых міністраў.

Было яшчэ адно цікавае захапленне Івана Іванавіча: ён заняўся вывучэннем магчымасцяў чалавечага мозга. Атрыманыя ў час даследаванняў рэзультаты і высновы ён дэманстраваў нам на сабе, заклікаючы актыўна іх выкарыстоўваць у паўсядзённай практыцы. У прыватнасці, ён быў глыбока ўпэўнены ў карысці вуснага лічэння для развіцця памяці і ўвогуле мыслення. Ведаў мноства арыгінальных, вельмі эфектыўных прыёмаў такога ліку, настойліва заклікаў настаўнікаў матэматыкі выкарыстоўваць іх на ўроках. Перад намі ж выступаў з дэманстрацыяй зусім феноменальных здольнасцяў мозга, якія ён змог развіць дзякуючы ўпартым і сістэматычным заняткам. Сядзім на яго папулярнай лекцыі. Ён паказвае нам магчымасці сваёй памяці. Просіць дзесяць прысутных калег назваць па адным пяцізначным ліку. Яго асістэнт запісвае гэту лічбавую паслядоўнасць на дошцы. Іван Іванавіч паварочваецца да гэтага запісу, хвіліны тры яго вывучае і пасля без ніводнай памылкі прагаворвае!

Яшчэ адна тэма аб'ядноўвала мяне з Іванам Іванавічам. Мы рэгулярна чыталі часопісы «Наука и жизнь», «Знание — сила», «Природа». Калі яны ў чытальнай зале былі на руках, то, як правіла, у яго ці ў мяне. І Мартынаў быў заўсёды «набіты» цікавымі звесткамі, фактамі з сучасных даследаванняў.

Мне зараз не хапае каларыту гэтай асобы.

**Пераклаў з рускай мовы Максім ВЕЯНІС.**

*(Працяг будзе).*

## ЗЯМЛЯ — ДЛЯ ЖЫЦЦЯ, КОСМАС — ДЛЯ ІНДУСТРЫІ

**У Беларусі зараджаецца адзін з самых грандыёзных касмічных праектаў. Такі вывад можна зрабіць па выніках III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Безракетная індустрыялізацыя блізкага космасу: праблемы, ідэі, праекты», якая прайшла ў Мар'інай Горцы.**

Вялікую цікавасць да мерапрыемства праявілі навукоўцы, даследчыкі і вынаходнікі з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вядучых ВНУ нашай краіны, Расіі і Украіны, Інстытута касмічных даследаванняў і тэхналогій (Балгарыя), Ягелонскага ўніверсітэта (Польшча), МТРІЗ Акадэміі (Германія), ХАМК (Фінляндыя), RMIT University (В'етнам), Амерыканскага ўніверсітэта ў ААЭ, профільнай Камісіі ААН, а таксама з Эстоніі, Італіі, Індыі, Вялікабрытаніі, іншых краін.

Арганізатар канферэнцыі — міжнародны некамерцыйны фонд EcoSpace, кампаніі-партнёры — ТАА «Астраінжынерныя тэхналогіі», ЗАТ «Струнныя тэхналогіі», СФГ Юніцкага.

Былі абагульнены вынікі навуковых работ, якія ажыццяўляюцца ў свеце па вырашэнні глабальных, у тым ліку экалагічных, праблем сучаснасці геакасмічнымі сродкамі, а таксама па сацыяльных, эканамічных, прававых аспектах рэалізацыі праграмы безракетнай індустрыялізацыі блізкага космасу; перспектывах інжынерна-тэхналагічнага асваення космасу ў рамках праграмы «ЭкаСвет»; асаблівасцях арганізацыі шырокамаштабных груза-пасажырскіх патокаў па маршруце Зямля—Блізкі космас—Зямля.

Гаварылася аб прынцыпах стварэння, канструявання, тэорыі і разліку транспартна-інфраструктурнага геакасмічнага комплексу — агульнапланетарнага транспартнага сродку Юніцкага (АТС); асаблівасцях праектавання, пошуку рашэнняў біялагічнага і экалагічнага характару для забеспячэння ўстойлівага функцыянавання замкнутай лакальнай экасістэмы і захавання біяразнастайнасці на планеце Зямля, асваення тэрыторый з неспрыяльнымі ўмовамі для жыцця чалавека, а таксама для стварэння маштабнай мадэлі будучага чалавечага паселішча ў касмічнай прасторы — жылога касмічнага кластара «ЭкаКасмаДом» (ЭКД); асаблівасцях стварэння экватарыяльнага лінейнага горада ў якасці неад'емнага кампанента сеткі струнных дарог TransNet, а таксама наземнай інфраструктуры АТС і яго ўзлётна-пасадачнай эстакады.

Па выніках канферэнцыі арганізацыйным камітэтам і ўдзельнікамі прыняты шэраг важных рашэнняў. У прыватнасці, адзначана надзвычай высокая важнасць далейшага развіцця тэмы шырокамаштабнага асваення блізкага космасу і перазагрузкі зямной індустрыі на касмічны вектар развіцця.

Падкрэслена значнасць геакасмічнага праекта планетарнага маштабу — АТС — як адзіна магчымага з інжынернага пункту гледжання транспартна-лагістычнага рашэння па індустрыяльным асваенні блізкага космасу і перазагрузкі праграмы «ЭкаСвет». Адзначаны першараднае значэнне і відавочная актуальнасць развіцця супрацоўніцтва паміж краінамі свету з мэтай рэалізацыі праграм «ЭкаСвет» і SpaceWay.

**Уладзімір ПАЎЛАЎ.**

Нефармат



# УРОКі ЖЫЦЦЯ І МУДРАСЦІ

Адна вельмі мудрая выкладчыца на журфаку гаварыла нам: для таго каб атрымаўся цікавы матэрыял пра чалавека, свайго героя трэба на час палюбіць. Вось ужо трыццаць гадоў упэўніваюся ў справядлівасці слоў сваёй настаўніцы. Больш за тое, ёсць героі, якіх светла ўспамінаеш не толькі пэўны час, а доўгія гады, калі не ўсё жыццё.

Менавіта такую гераіню мне некалі пашчасціла сустрэць у Пінскім раёне. Раздрукоўку магнітафоннага запісу гутаркі з ёй захоўваю ў адмысловай папцы з самымі дарагімі матэрыяламі. На жаль, Ульяны Кірылаўны Мельнік няма ўжо — пра гэта паведаміў старшыня сельскага Савета. А ў час нашай сустрэчы ёй было ўжо за восемдзесят... Перад самай вайной 18-гадовая Ульяна выходзіла замуж за прыгожага хлопца Карнея Цярлецкага. У 44-м яго забралі на фронт, а ў 45-м яна атрымала пахаванку. Засталася з двума малымі дзецьмі і гектарам зямлі, бо калгасаў яшчэ не было. Выжывала, як магла. Навучылася шыць, прыдбала машынку. Шыла, а ў якасці аплаты ёй дапамагалі апрацоўваць поле. Потым брат падарыў фотаапарат і яна асвоіла фотасправу, стала фатографам на ўсю акругу. Так і сустрэла свайго другога сужэнца. Франтавік Аляксандр Мельнік прыйшоў да яе, каб зрабіць фотаздымак на дакументы.

Мужа Аляксандра, з якім пражылі 35 гадоў, яна называла Оліська. Ульяна Кірылаўна размаўляла на прыгожай сакавітай палескай гаворцы, якую хораша апісаў Колас у рамане «На ростанях». Калі перачытваю разважанні пра жыццё простай вясковай жанчыны, нібы чую яе саму.

**«Пра сакрэты доўгалецця.** Я столькі гора пабачыла, так цяжка жыла, не ведаю, чаму мяне доўга Бог трымае на зямлі. Можа, за тое, што ні з кім не сварылася. Я ніколі не лаялася ні з адной суседкай. Не мела паняцця, як крычаць на мужа, ні з першым, ні з другім не ўчыняла сварак.

**Пра захаванне шлюбу.** Мой Оліська, як маладзейшы быў, то часам і выпіць мог. Бывае, прыйдзе дахаты пазнавата, п'яны, і адразу да мяне: «Ульянка, пакажы паспяваць». У такім стане вельмі ахвочы быў да спеваў. Я ніколі не насварыся на яго, але кажу: «Добра, зараз паспяваем». А сама стараюся ўладкаваць на ложак (ён нанапдітку хутка засынаў), потым сцягну чаравікі, накрыю. А назаўтра раненька ўстану, карову дагледжу, снядаНак настаўлю, словам не папракну. А ён і сам вінавата пазірае, усё разумее. Дык навошта ў сям'і разлад чыніць?

А жанчыны, бывала, прыходзяць у брыгаду, і адна перад адной хваляцца: мой, маўляў, прыйшоў нападпітку, а я яго давай лаяць, ён агрызаецца — а я яшчэ болей, ён біцца падступае — а я не перастаю. Іншая хоць з гузаком ходзіць, ды задаволеная, што мужыка добра паўшчувала. Цяпер жа і наогул маладыя, як што крышку не так, не толькі лаяцца альбо біцца, але адразу ў суд бягуць разводзіцца. Ураз свабодныя, але ці шчаслівыя?

**Пра шанаванне бацькоў.** Цяпер маладыя ці жэняцца, ці разводзяцца — бацькоў не пытаюць. А ў нас было не так. Мой Оліська прыйшоў сватацца, я яму нічога не адказала, сказала, што павінна спытаць бацькоў. Пабегла адразу да бацькі і маці. Бацька выслухаў мяне і маўчаў, можа, з паўгадзіны. Потым прамовіў: ён з добрай сям'і — не п'яніца, не гультай, можаш ісці, дачка. Я ж не дзяўчына была, удава. Але і другі раз замуж пайшла толькі з блаславення бацькоў.

**Пра гарэлку.** Людзей гарэлка згубіла, раскоша звяла. Лёгка жывуць, працай да сёмага поту хлеб не здабываюць. А без гарэлкі наогул нічога не робіцца. Зараз, калі чалавека папросіш памагчы ў гаспадарцы, трэба спачатку бутэльку паставіць з закускай, работнік вып'е, а потым пойдзе нешта рабіць. Калі мы хату з мужам будавалі, таксама людзей наймалі, але ніхто нават не заікаўся пра нейкую выпіўку.

Калі вяселле маё з Карнеем было, то бацька завёз у Пінск мех круп і абмяняў яго ў манапольцы на пяць чацвярцінак гарэлкі. Гэта ўжо лічылася знатным вяселлем. А цяпер колькі скрыняў трэба на вяселле альбо на іншую ўрачыстасць?

**Пра злачыннасць і бяспеку.** Людзі шмат п'юць, лёгка жывуць, сталі больш разбэшчаныя. Я калі ў газеце прачытаю ці ўбачу ў тэлевізары, што забілі каго або дзяўчыну згвалтавалі, некалькі дзён спаць не магу, плачу. Адкуль столькі зладняў на свеце развялося? Да мяне ж, бывала, прыедзе чалавек з далёкай вёскі, я падхаплю фотаапарат і паехала з ім. Еду з маладым мужчынам 12 кіламетраў праз лес, а яму ў галаву не прыйдзе нават слова якое непрыстойнае сказаць, а мне падумаць, што трэба нечага апасацца. Хоць і бачыла гэтага чалавека часцей за ўсё першы раз.

**Пра тэхнічны прагрэс.** Сядзіць неяк мой унук насупраць, гуляе з мабільнікам, шчоўкае. А потым кажа: вось, баба, твой здымак гатовы. І праўда, зняў на мабільны, потым можна раздрукаваць альбо адправіць фота хоць на іншы канец. Вось як далёка пайшла навука, якія прыстасаванні прыдумалі. Але, здаецца, каб прыдумаў хто, як людзям набрацца больш дабрыні і спагады».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.59 | 19.02 | 12.03 |
| Віцебск — | 6.49 | 18.52 | 12.03 |
| Магілёў — | 6.49 | 18.52 | 12.03 |
| Гомель — | 6.46 | 18.49 | 12.03 |
| Гродна — | 7.15 | 19.18 | 12.03 |
| Брэст — | 7.15 | 19.18 | 12.03 |

### Месяц

***Першая квадра ў 4.55. Месяц у сузор'і Казярога.***

### Імяніны

*Пр.* *Фядоры, Віктара, Германа, Дзмітрыя, Мікалая, Сяргея.*
*К.* *Марыны, Яніны, Герарда, Германа, Тодара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА





## Даты | Падзеі | Людзі

### 24 ВЕРАСНЯ

**У краіне**

**1815** год — нарадзілася (цяперашні Смаргонскі раён) Габрыеля Пузына, польская пісьменніца. Аўтар зборнікаў паэзіі «У імя Бога!», «Прозай і вершам», зборніка «Аматарскі тэатр», успамінаў «У Вільні і ў літоўскіх дварах» і іншых.

**1880** год — у Мінску заснавана музычна-літаратурнае таварыства.

**1910** год — заснавана Слонімская жаночая гімназія. У гімназіі меліся падрыхтоўчы і сем асноўных класаў. Сярод выкладчыкаў былі выпускнікі ўніверсітэтаў Масквы, Пецярбурга, Кіева, Міргарадскай прамыслова-мастацкай школы, Беластоцкага Мікалаеўскага інстытута, гімназій Гродна, Гомеля і іншых. Падчас Першай сусветнай вайны (1915) гімназія была пераведзена ў Калугу. У 1918-м спыніла дзейнасць.

У гэты ж дзень у Быхаве нарадзіўся Навум Ізраілевіч Цырульнікаў, контрадмірал. З 1928-га служыў у Ваенна-марскім флоце. У 1939—1945 гадах — начальнік аператыўнага аддзела штаба Ціхаакіянскага флоту. Удзельнік вайны з Японіяй. З 1947-га — камандуючы ваенна-марской базай, у 1951—1954 гадах — камандзір дывізіі падводных лодак.



**1920** год — 24—27 верасня ў Мінску прайшоў першы з'езд камсамола Беларусі.

**1955** год — Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіў тэкст і музыку Дзяржаўнага гімна Беларускай ССР (тэкст Міхася Клімковіча, музыка Нестара Сакалоўскага).

**1995** год — Гродзенскую Барыса-Глебскую царкву наведаў патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій ІІ.

**У свеце**

**1870** год — нарадзіўся Жорж Клод, французскі інжынер, хімік, вынаходнік неонавай лямпы.

**1905** год — нарадзіўся Севера Ачоа, амерыканскі біяхімік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіялогіі і медыцыне. Унёс уклад у расшыфроўку генетычнага кода і механізма біясінтэзу нуклеінавых кіслот.



**1945** год — нарадзілася Ларыса Аляксееўна Рубальская, расійскі паэт-песеннік.

**1955** год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Башыраў, расійскі акцёр кіно, тэлебачання і дубляжу, кінарэжысёр, сцэнарыст, прадзюсар, кліпмейкер.

**1960** год — у ЗША на ваду спушчаны першы атамны авіяносец «Энтэрпрайз».

**1970** год — упершыню ў гісторыі асваення касмічнай прасторы савецкая аўтаматычная станцыя «Месяц-16» даставіла на Зямлю ўзоры месяцавага грунту.

**Так гаварыў...**

**ЖАН-ЖАК РУСО:**

*«Мая справа сказаць праўду, а не прымушаць верыць у яе».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Вашы плюсы і недахопы? Сцісла.**

**— Думаю правільна! Але ўголас.**

Як казала цётка Галя:

— З гадамі больш за ўсё расчароўваюць цэны, люстэрка і аналізы...

**— Кастусь, вашы джынсы я ўчора па-суседску памыла, адпарыла, і яны сталі карацейшыя. Так што падшываць іх зусім не трэба.**

**— Дык гэта што атрымліваецца, я вам учора дарэмна шакаладку прэзентаваў?**






ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2852.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 верасня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12